Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

СЬНЕЖАНЬ 26 1932 г. № 288 (4540)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЛІКВІДАВАЦЬ ГАНЕБНАЕ АДСТАВАНЬНЕ

У той час, калі Маскоўская вобласьць па 20 сьнежня ўжо выканала звыш 92 проц. гадавога пляну, а Заходняя вобласьць—звыш 70 проц., мы па БССР маем усяго 37,6 проц. выкананьня ільназагатовак.

На першым месцы ідуць саўгасы, якія зрабілі 72,1 проц. ільнавалакна. Недапушчальна адстае калгасны сэктар, які выканаў 45,4 проц. заданьня. Асабліва выпукляецца адставаньне калгасаў, якія абслугоўваюцца МТС (заданьне выканана па 37,1 проц.). Зусім дрэнна ідуць загатоўкі па аднаасобным сэктары—27,5 проц. Недапушчальна слабы націск на кулацка-заможныя элемэнты вёскі. Яны здалі ўсяго толькі 17,2 проц. валакна, якое з іх прылічваецца.

Характэрна, што за чацьвертую пяцідзеўку мы маем нават зьніжэньне тэмпаў. Калі за мінулыя пяць дзён БССР выканала 5,7 проц. гадавога пляну, дык у чацьвертай пяцідзеўцы мы маем зьніжэньне да 4.1 проц.

Матар'ялы, якія друкуе ў апошні час «Зьвязда», паказваюць, што партарганізацыі некаторых ільнаводчых раёнаў (Расоны, Сянно, Полацак, Дуброўна) да апошняга часу не заўважылі тай клясавай барацьбы, якая разгарнулася вакол ільназагатовак, не заўважылі кулацкага сабатажу, таксама як і апартуністаў з партбілетамі ў кішэні ў сваіх радах. Гэта прывяло да ганебнага адставаньня ільнаводчых раёнаў, якія выканалі сваё заданьне ўсяго на 36 проц.

Толькі палітычная блізарукасьць і злачынная бяздзейнасьць раённых арганізацый можна вытлумачыць беспакараную шкодніцкую работу кулацтва і яго агентуры ў калгасах Расонскага, Сеньненскага, Полацкага і некаторых іншых раёнаў.

Кулак усімі сіламі імкнецца разбазарыць лён, расьцягнуць тавараную прадукцыю, сарваць ільназагатоўкі. Для дасягненьня гэтай мэты ён ня грэбае ніякімі сродкамі. У калгасе «Баявік», Расонскага раёну, лён выдаюць нібы та... «на лапці», у Шклоўшчыне, у калгасе імя Дзяржынскага, ільпатрэсту не здаюць і расьцягваюць таму, што яна быццам «дрэнная і лепш скарыстаць не для подсьцілу».

Гэтыя адкрытыя кулацкія выступленьні часта ня толькі не сустракаюць адпору з боку мясцовых работнікаў, а наадварот, карыстаюцца іх падтрыманьнем (сакратар парт'ячэйкі калгасу «Пралетары» Шашын, член Гомельскага сельсавету Акунько, старшыня калгасу Куксёнак— Полаччына).

Мы ня можам прайсьці міма зусім нездавальняючай работы апарату Загатільну, як у цэнтры, так і на мясцох. Загатлён аказаўся няздольным паладзіць апэрацыйнае кіраўніцтва ходам ільназагатовак. Дагэтуль мы ня маем штодзённай справаздачнасьці аб ходзе ільназагатовак, як гэта зроблена ў Заходняй вобласьці.

Рад раённых кантор Загатільну да апошняга часу зусім не падрыхтаваліся да прыёму ільнавалакна (адсутнасьць належных памяшканьняў, вагі, людзей). Ля прыёмачных пунктаў у Дубровенскім і Шклоўскім раёнах можна было заўважыць чаргі калгасьнікаў і аднаасобнікаў, якія пэўнымі днямі чакалі прыёмкі ільнапрадукцыі. У радзе месц канторы Загатільну засьмечаны клясава-варожымі элемэнтамі. Загатлён і яго аддзяленьні на мясцох яшчэ не сталі арганізатарамі загатовак ільнавалакна.

Практыка перадавых калгасаў, якія выканалі свае абавязкі перад дзяржавай, паказала вялізарную ролю пастаяннай вытворчай калгаснай брыгады ў пасьпяховым і сваячасовым выкананьні ільназагатовак. Там, дзе на апрацоўцы ільну працуюць пастаянныя людзі, якія нясуць за гэта адказнасьць, дзе ёсьць правільны штодзенны ўлік работы калгасьнікаў на апрацоўцы ільну і аплата па колькасьці і якасьці,—там мы маем бліскучыя вынікі.

Толькі дзякуючы правільнай расстаноўцы рабочай сілы ўнутры пастаянных вытворчых брыгад і прыцягненьня да гэтай справы ўсяго калгаснага актыву, калгасы Калышанскага і Чарніцкага сельсаветаў (Лёзьнянішчына) здолелі датэрмінова здаць дзяржаве добраякасную ільнапрадукцыю.

Такія калгасы ёсьць у кожным раёне, але уся бяда ў тым, што раённыя арганізацыі ня вывучылі вопыту лепшых калгасаў і брыгад не зрабілі яго здабыткам усёй калгаснай масы.

Лён—адказьнейшы участак клясавай барацьбы ў ільнаводчых раёнах. Па гэтым участку цяпер зараз палітычная бяздольнасьць партыйных арганізацый і кожнага камуніста ў паасобку. Практыка перадавых калгасаў і сельсаветаў паказала, што мы маем усе аб'ектыўныя ўмовы для пасьпяховага скончэньня ільназагатовак у бліжэйшыя дні.

Перш за ўсё мы гэтага патрабуем ад Лёзьнянішчыны, якая паказала бальшавіцкія ўзоры ў барацьбе за лён у часе сяўбы і ўборкі.

Лёзна, а таксама Гарадок, Дуброўна, Мсьціслаўе, Сянно, Сіроцына, Шклоў павінны ў бліжэйшыя дні рапартаваць партыі і ўсёй краіне аб поўным выкананьні пляну ільназагатовак. Лёзьнянішчына мае для гэтага ўсе ўмовы.

Услед за імі і ўсе іншыя раёны БССР, на аснове шырокай растлумачальнай работы сярод ільназдатчыкаў, бязьлітаснай барацьбы з кулацтвам і яго агентурай, ачысьцілі рады партыі і ўвесь савецкі апарат ад апартуністаў, перараджэнцаў, пры дапамозе ўсяго калгаснага і васковага актыву—здолеюць пасьпяхова і сваячасова закончыць ільназагатоўкі і забясьпечыць нашу прамысловасьць добраякасным ільнавалакном.

Чорная дошка зрыву ільназагатовак

За злоснае і сыстэматычнае невыкананьне пляну дзяржаўных загатовак сельгаспрадуктаў, за сабатаж, арганізаваны кулацкімі элемэнтамі, пастановай СНК БССР і ЦК КП(б)Б занесены на чорную дошку наступныя раёны і сельсаветы:

Раёны:

1. Тапачынскі, 2. Горацкі, 3. Кармянскі, 4. Дубровенскі, 5. Асьвейскі.

Сельсаветы:

па Чачэрскім раёне: Будзішчанскі і Глыбачанскі,
па Буда-Кашалёўскім: Нядальскі, Патапаўскі і Губіцкі,
па Менскім раёне: Карапішчанскі, Абчацкі, Папярнянскі,
па Віцебскім: Старасельскі і Рудакоўскі,
па Сеньненскім: Машчонскі і Алексінскі,
па Дзяржынскім: в. в. Станкава, Каменка і Шатаноўшчына.
па Пятрыкоўскім раёне: Ліпніцкі, Гліненскі і Асавецкі сельсаветы,
па Клімавіцкім раёне: Красавіцкі сельсавет,
па Лепельскім раёне: Ляхаўскі сельсавет і вёскі Бабна, Кругляцы і Стальбцы,
па Чэрыкаўскім раёне: Каменскі сельсавет,
па Бягомльскім раёне: Дамаржыцкі сельсавет.
па Чавускім раёне: Праздкоўскі, Рабаўскі і Дзеднаўскі,
па Лагойскім раёне: Гайнінскі.

ДАДАТКОВА ЗАНОСЯЦЦА НА ЧОРНУЮ ДОШКУ НАСТУПНЫЯ СЕЛЬСАВЕТЫ:

па Нараўлянскім раёне: Мухаедаўскі, Хаткоўскі,
па Чашніцкім раёне: Ульпянавіцкі,
па Магілеўскім раёне: Вышаўскі, Хонаўскі, Рафалаўскі, Гусьпішчанскі

У гэтых раёнах і сельсаветах неадкладна спыняецца падвоз тавараў і каапэрацыйны і дзяржаўны гандаль на месцы.

Вывозяцца з каапэрацыйных крам і складаў усе наяўныя прамтавары.

Поўнасьцю забараняецца калгасны гандаль.

Спыняецца ўсякага роду крэдытаваньне і датэрмінова спаганяюцца ўсе выданыя крэдыты і інш. фінансавыя абавязацельствы.

АДНА СПРАВА ЗАПІСАЦЬ, А ДРУГАЯ—ВЫКАНАЦЬ...

15 сьнежня аб'яднанае пасяджэньне бюро РК і прэзыдыум РКК КП(б)Б Полацкага раёну прыняла, што выкананьне пляну загатовак, асабліва ільну, праходзіць зусім нездавальняюча.

За невыкананьне пляну ільназагатовак былі занесены на чорную дошку Балаўскі, Салонецкі, Гарадоцкі, Нацкі, Шпакоўшчынскі, Алесаўскі, Бабініцкі і Сястронскі сельсаветы.

На 15-га сьнежня плян загатовак ільнавалакна быў выкананы толькі на 32,4 проц., прычым кулацка-заможная гаспадаркі здалі толькі на 27,4 проц. належачага з іх ільну.

У радзе сельсаветаў і калгасаў раёну работа па апрацоўцы і здачы ільнавалакна была пастаўлена недапушчальна дрэнна.

Напрыклад, старшыня калгасу імя Мялешкі (Бабініцкі сельсавет) член партыі Куксёнак пальцам аб палец ня стукнуў для таго, каб правільна арганізаваць работу па апрацоўцы ільну, каб сваячасова здаць дзяржаве апрацаваную прадукцыю. Толькі 1-га сьнежня ў калгасе была арганізавана брыгада па апрацоўцы ільну. Але з прычыны таго, што ў гэтай брыгадзе ня была ліквідавана ўраўнілаўка, што ўлік працы адсутнічаў, прадукцыйнасьць яе работы была надзвычай нізкая. Замест 10 клгр. калгасьнікі атрымалі ня больш 3—4 клгр. ільну ў дзень, а ў паасобных выпадках выпрацоўка зьнижалася да... 800 грам.

Нельга прайсьці міма і такога абурэючага факту: «камуніст» Куксёнак яшчэ да гэтага часу не палічыў патрэбным здаць дзяржаве тое валакно, якое доўгі час ляжыць у калгасе.

Да рэчы — зараз бюро мясцовай партыйнай ячэйкі выключыла Куксёнка з партыі, але... ніякіх практычных мер па выкананьні ільназагатовак ні ячэйка, ні праўленьне калгасу ня ўжыта.

Асноўнай прычынай адставаньня на фронце ільназагатовак у Полаччыне зьяўляецца тое, што кіраўнікі раду сельсаветаў (Пугачоў — Гарадоцкі, Ішчанка — Тураўлянскі, Барэйка — Бабініцкі, Гавяза — Верхачэнскі і інш.) натуралі кулацкаму сабатажу, не процідаставілі кулацкай агітацыі разгорнутай масавай работы сярод калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў.

Ня меншай прычынай адставаньня зьяўляецца таксама і тое, што як Ветрынская МТС на чале з дырэктарам Суднікам, так і кантора «Загатільну» (Цішкоў) праявілі поўную бязьдзейнасьць на важнейшым участку сваёй работы.

А Полацкі народны суддзя Назарук і раённая пракуратура недапушчальна зацягвалі разгляд справы кулацкіх агентаў Пугачова, Лашкова і іншых простых вінаватых зрыву загатовак.

Аб'яднанае пасяджэньне бюро РК і РКК КП(б)Б моцна ўдарыла па кулацкай агентуры, па зрыўшчыках загатовак. Рад асоб зьнят з работы і выключан з партыі. Адначасова аб'яднанае пасяджэньне вызначыла рад практычных мерапрыемстваў, якія-б забясьпечылі выкананьне ільназагатовак да 20 сьнежня ня менш як на 70 проц.

Вызначаны тэрмін прайшоў. А якія рэзультаты?

Як падатнае, можна адзначыць тое, што калгас імя Лекерта выканаў плян здачы ільнавалакна ўжо 17 сьнежня; да 20 сьнежня быў поўнасьцю выкананы плян ільназагатовак калгасам імя Варашылава. І ўсё.

Але гэтыя два факты ні ў якім разе ня могуць нас задаволіць. Першая пяцідзеўка пасьля 15 сьнежня, г. зн. пасьля пасяджэньня РК і РКК КП(б)Б дала толькі 2,6 проц. выкананьня пляну. У раёне ўсё яшчэ маюць месца патураньне клясава-варожым элемэнтам. Кулацкі сабатаж ня зломлены.

Прыязджаем некалькі прыкладаў. Да вёскі Чорнапсьле, Гомельскага сельсавету, быў прымацован член сельсавету Афонька, якому было даручана правесьці работу па выкананьні пляну ільназагатовак. Між тым ён ня толькі нічога не зрабіў у гэтым напрамку, але і сам ня здаў дзяржаве ні аднаго кілёграму ільну, ні аднаго кілёграму збожжа.

А вось, што робіцца ў Арлейскім сельсавеце. Сакратар партыйнай ячэйкі калгасу «Пралетары» Шашын, на вачох у якога кулацка-заможныя элемэнты сабатавалі выкананьне даведзеных да іх цьвёрдых заданьняў, заявіў:

— Калі я пайду спаганяць цьвёрдыя заданьні, то гэтым самым я падарву свой аўтарытэт у вачох мясцовых сялян...

Усе гэтыя факты лішні раз сыгналізуюць аб тым, што без бальшавіцкіх мер, без рашучай барацьбы з кулаком і яго агентурай пасьпяховае выкананьне пляну ільназагатовак нямысліма. Мала напісаць прыгожую пастанову, трэба правесьці яе ў жыцьцё.

Практыка калгасаў імя Лекерта і імя Варашылава паказала, што пры правільнай арганізацыі працы вытворчых брыгад плян ільназагатовак можа быць выкананы у найкарацейшы тэрмін.

Канкрэтна:

у калгасе імя Лекерта былі створаны пастаянныя брыгады па апрацоўцы ільну. У гэтых брыгадах добра пастаўлен дыфэрэнцыяваны ўлік, праўленьне калгасу пільна прыслухоўвалася да каштоўных заўваг радавых калгасьнікаў. Усё гэта забясьпечыла высокую прадукцыйнасьць працы. Ударніцы Сабаленка Г., Галоўчанка К., Пахомчанка Марыля і інш. атрымалі за дзень па 10—15 клгр. ільнавалакна, прычым прадукцыя іх была высокай якасьці.

Апрацаваны лён неадкладна адвозіўся на прыёмачны пункт.

Рэзультатам добрай пастаноўкі работы ў калгасе імя Лекерта была ня толькі датэрміновая здача ільнавалакна, але і тое, што за апошні час рад працоўных аднаасобнікаў, якія наглядна пераканаліся ў перавагах калектыўнай працы, падалі заявы аб уступленьні ў калгас.

Гэты вопыт перадавых калгасаў павінен стаць здабыткам усіх сельсаветаў, усіх партыйных ячэек, усіх калгасаў Полаччыны і іншых раёнаў БССР.

Тав. Галадзед у Лагойскім раёне

24 сьнежня старшыня СНК БССР тав. ГАЛАДЗЕД наведаў Лагойскі раён па пытаньні загатовак. Выехаўшы непасрэдна ў Гаенскі сельсавет, тав. Галадзед выступаў на шырокім сходзе сялян.

Азнаёміўшыся са становішчам загатовак у раёне, тав. Галадзед разам з раённым кіраўніцтвам вызначыў рад мерапрыемстваў, якія павінны забясьпечыць пералом у загатоўках збожжа і іншых відаў с.-г. культур.

АБ ХОДЗЕ ЗАГАТОВАК ПА БССР

З дакладу т. Гікало на сходзе менскага гарадзкога партыйнага актыву

У сваім дакладзе тав. Гікало спыніўся перш за ўсё на пастанове ЦК УсеКП(б) аб ходзе загатовак у Беларусі.

Тав. Гікало падкрэсьліў, што пастанова ЦК УсеКП(б) акрэсьлівае тыя задачы, якія стаяць перад кампартыяй Беларусі ў сувязі з адставаньнем па лініі сельгаспадагатовак, у асабліваснці па аднаасобным сэктары.

ЦК УсеКП(б),—гаворыць тав. Гікало,—зусім правільна прызнаў, што незадавальняючая работа ЦК КП(б)Б і СНК БССР па загатоўках зьяўляецца рэзультатам гніла-лібэральных адносін партыйных і савецкіх арганізацый да загатовак—гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай задачы, якая стаіць зараз перад бальшавікамі Беларусі.

Неабходна з усёй сілай падкрэсьліць, што на сёньня мы яшчэ ня маем пералому ў ходзе загатовак. Усе паказальнікі, якія ў нас ёсьць па збожжазагатоўках, мясазагатоўках, па ільну і бульбе, паказваюць з усёй відавочнасьцю, што яшчэ не ва ўсіх раённых арганізацыях, не ва ўсіх цэнтральных арганізацыях ёсьць выстарчальнае разуменьне неабходнасьці ўзьняцьця з усёй бальшавіцкай цьвёрдасьцю і рашучасьцю на барацьбу за сваячасовае і поўнае выкананьне загатовак.

Якія мы маем паказальнікі на сёньняшні дзень?

На 20-га сьнежня плян па збожжы выкананы толькі на 67,6 проц.

Да 1-га студзеня 1933 г. мы павінны даць стопроцантнае выкананьне пляну па збожжы. Хоць апошнія пяцідзеўкі даюць ужо поўнае павышэньне, аднак, гэта нарастаньне тэмпаў яшчэ далёка не забясьпечвае сапраўднага выкананьня загатовак ва ўстаноўленыя ЦК УсеКП(б) тэрміны.

Калі мы возьмем лічбы па пяцідзеўках, то атрымаем наступны малюнак:

Першая пяцідзеўка сьнежня дае 1.313 тон, другая—658, трэцяя—1.945, чацьвертая—4.019.

Як бачыце, нарастаньне тэмпаў бясспрэчна, але яно ўсё-ж яшчэ невыстарчальна для выкананьня гадавога пляну па збожжы да 1-га студзеня. За 10 дзён, якія засталіся, нам трэба загатовіць яшчэ 25—26 тыс. тон, а гэта значыць, што трэба загатаўляць у пяцідзеўку 13 тыс. тон. Між тым чацьвертая пяцідзеўка дала толькі 4 тыс. тон. Каб выканаць плян, мы абавязаны штодзенна загатаўляць 2.5 тыс. тон, а на справе мы даем ракуль што толькі 1.700—1.800 тон. Гэта ставіць пад пагрозу выкананьне пляну да тэрміну. Тыя, што сёньня гавораць аб пераломе, гавораць простую няпраўду, накіраваную на сутнасьці справы на тое, каб размагнэсаваць, разброіць партыйную арганізацыю і сарваць выкананьне пляну ў канчаткова-ўстаноўленыя тэрміны.

Што мы маем па мясу?

І па мясазагатоўках тэмпы ўсё яшчэ застаюцца невыстарчальныя. Намі загатоўлена каля 12 тыс. тон, застаецца загатовіць 4 тыс. тон. У сярэднім у дзень нам трэба загатаўляць больш 400 тон, за пяцідзеўку —2,5 тыс. тон, між тым мы загатаўляем у сярэднім 200—250 тон у дзень.

Хіба ня ясна, што і тут гутаркі аб дасягнутым пераломе вядуць да аслабленьня нашай увагі і націску на поўнае і сваячасовае выкананьне пляну.

Па ільнавалакну. Тут становішча проста ганебнае. Трэба з усёй адкрытасьцю сказаць, што па гэтай лініі мы цягнемся ў хвасьце іншых раёнаў Савецкага саюзу, вялучых загатоўкі ільну. Нам трэба выканаць да 1-га студзеня 1933 году 70 проц. гадавога пляну, а між тым на 20 сьнежня мы выканалі толькі 37,6 проц. З 21 тыс. тоны паводле пляну мы загатовілі толькі 10 тыс. тон, нам застаецца яшчэ 11 тыс. тон, або штодзенна загатаўляць у сярэднім 1.200—1.700 тон, а ў пяцідзеўку каля 6,5 тыс. тон. Між тым, у апошнюю пяцідзеўку мы далі толькі 2.000 тон. Каб выканаць сваячасова і поўнасьцю пляны па ільну, мы павінны дабіцца прынамсі патраенага тэмпу здачы.

Па бульбе. Хоць тут мы маем і некалькі больш час па загатоўках, але тэмпы і тут таксама не забясьпечваюць сваячасовага выкананьня пляну. Мы выканалі на 20 сьнежня 74 проц. Нам засталося загатовіць больш 100 тыс. тон. Для таго, каб выканаць плян па бульбе, нам трэба штодзенна загатаўляць мінімум 5—6 тыс. тон, а за апошнія дні мы загатаўлялі ў сярэднім па 250—300 тон у дзень бяз уліку загатовак бульбы прамысловасьцю.

Па загатоўках масла, сена, ільнасемя і г. д. даныя паказваюць, што і тут сур'ёзнага зруху пакуль яшчэ няма.

У асабліваснці адстаюць у выкананьні дзяржаўных сельска-гаспадарчых загатовак аднаасобнікі: **па збожжы**, пры сярэдняй у 67.8, аднаасобнікі здалі 62,3, **па мясу**—74.9, аднаасобнікі—53 проц., **па ільнавалакну**, пры сярэдняй у 37,6, аднаасобнікі—27,5, **па бульбе**: калгасы—88,3, аднаасобнікі—55,1 і г. д.

Такавы даныя па 20 сьнежня.

Гэта ўказвае на неабходнасьць самага рашучага ўзмацненьня загатовак у аднаасобным сэктары.

І так, мы ня вытрымліваем тэмпаў. Таму ўсякія гутаркі аб пераломе зьяўляюцца злачыннымі, апартуністычнымі гутаркамі, дэмабілізуючымі партарганізацыю ў барацьбе за збожжа, мяса, лён і г. д.

Усьнікае, таварышы, пытаньне: ці няма ў нашых плянах па збожжы, мясу, ільну і бульбе прапавяліченьня, ці ня выклікана наша адставаньне некаторым перанапружаньнем пляну? Ні ў якай меры. Так пытаньне ў нас не стаяла і ніяк не стаіць. Ня было яшчэ ні аднаго раёну, які-б у момант спуску пляну да раёну, а потым да вёскі ставіў пытаньне аб невыкананьні гэтых пляну. Апошні толькі Перахаўскі раён, яшчэ не пачаўшы разгортваць загатовак, месяцаў паўтары-два таму назад заявіўся да нас з гутаркамі аб тым, што пляны, моў, па збожжы вялікія. Мы па-чэсному раёну ў свой час упарылі і прапанавалі яму неадкладна разгарнуць неабходную работу па сваячасовану і поўнаму выкананьню пляну, бо і па гэтаму зьяўляюцца пляну загатовак у параўнаньні з мінулым годам пры вялізнасьці росту пасеваў.

Калі-б хто-небудзь адважыўся ўспіць пад сумненьне рэальнасьць нашых пляноў, мы маглі-б сьмела заявіць, што, па-першае, гэта хлусьня, а, па-другое, што гэта зайшло зыходзіць ад клясавага ворага. Чаму? Па-першае, таму, што пляны гэтага году значна зьніжаны ў параўнаньні з мінулым годам. На адным збожжы гэта зьніжэньне выяўляецца ў 40 з лішкам тысяч тон, што складае 40 проц. пляну загатовак 1931 году. Па-другое, пляны загатовак у гэтым годзе ўпярыню спускаліся на месцы пры самай актыўнай прапрацоўцы і з боку раённага актыву і з боку сельскага і калгаснага актыву. Па-трэцяе, у гэтым годзе значна пашырана пасеўная плошча. І, нарэшце, па-чацьвертае, мы маем у арганізацыі загатовак вопыт, набыты за апошнія гады, а таксама рад пастаноў партыі, якія стымулююць загатоўкі.

Паўтараю, ня можа быць ніякага сумненьня ў тым, што нашы пляны зусім рэальныя. Гэта пацьвярджаецца бальшавіцкай работай раду раёнаў, якія здолелі дабіцца ня толькі выкананьня, але і перавыкананьня пляну збожжазагатовак. Гэта —Жыткавіцкі раён, які выканаў плян на 119,5 проц., Тураўскі раён—102 проц., Буйдзенскі — 101 проц., Камарынскі — 100,9 проц., Слуцкі і Менскі, якія ня сёньня, дык заўтра заканчваюць свае пляны.

Па мясу перавыканалі свае пляны Тураўскі—143 проц., Бярэзінскі—117 проц., Менскі—116 проц., Чашніцкі—108 проц. і г. д.

Па іншых відах сельска-гаспадарчых загатовак пляны ў радзе раёнаў таксама ня толькі выконваюцца, але і перавыконваюцца. Гэта бясумоўна гаворыць аб тым, што пры ўмове разгортваньня сапраўднай балвой бальшавіцкай работы мы можам поўнасьцю выкаваць пляны загатовак ва ўстаноўленыя тэрміны.

Посьпехі асобных перадавых раёнаў не пакідаюць ніякага сумненьня ў тым, што партарганізацыі ў адстаўных па загатоўках раёнах Беларусі яшчэ да гэтага часу не ўзьняліся на барацьбу за выкананьне пляну, праяўляючы гніла-лібэральныя адносіны да справы. Па кулаку, па перараджэнскіх і сабатуючых загатоўкі элемэнтах у партыі гэтыя парторганізацыі яшчэ на сёньняшні дзень ня ўдарылі, не зламілі супраціўленьня клясавага ворага, не ўсьвядомілі ўсёй важнасьці пастаноў ЦК УсеКП(б), патрабуючых карэннай перабудовы ўсёй нашай работы па сельска-гаспадарчых загатоўках.

Вось якія ганебныя даныя на 20 сьнежня мы маем па радзе ільнаводчых раёнаў: Асьвейскі раён выканаў плян па ільнавалакну на 15,2 проц., Шклоўскі—28 проц., Гарадоцкі—24,8 проц., Дубровенскі — 16 проц., Расонскі—26,3 проц. Па збожжы і мясу маем таксама рад ганебна адстаючых раёнаў.

Нельга ўявіць сабе справу так, што вось, моў, ёсьць пастанова ЦК УсеКП(б), рад пастаноў і мерапрыемстваў ЦК КП(б)Б—і справа цяпер сама пойдзе. Нічога падобнага. Вы ведаеце пастанову аб заняцьці на чорную дошку раду раёнаў і сельсаветаў з усімі выцякаючымі адсюль вынікамі. Мейце на ўвазе, што заняцьце на чорную дошку раду сельсаветаў было зроблена па просьбе раённых работнікаў. І вось зараз мы атрымліваем рад матар'ялаў, якія сьведчаць аб тым, што хаця партыйнае і савецкае кіраўніцтва раёнаў само прасіла занесьці сельсаветы на чорную дошку, аднак, яно на справе са свайго боку нічога не зрабіла для правядзеньня раду канкрэтных мерапрыемстваў, якія выцякаюць з заняцьця гэтых сельсаветаў на чорную дошку. Такога роду рэгаваньне зьяўляецца ўзорам чыста дэкларацыйных адносін да пастаноў ЦК, адносін, якія падмяняюць работу па загатоўках і барацьбу на справе з клясава-варожымі і перараджэнскімі элемэнтамі парадняй старавой справы і славеснай трасакітэй.

Мы можам дабіцца перамогі толькі ў тым выпадку, калі па-бальшавіцку арганізуем барацьбу ні на словах, а на справе за выкананьне пляну загатовак на аснове пастановы ЦК, ні на хвіліну не забываючы пры гэтым, што пры правядзеньні гэтай пастановы нам прыдзецца перамагаць вялікае супраціўленьне клясавага ворага.

Ужо зараз у паасобных камуністаў ёсьць такога роду настрої, што, моў, пастанова ЦК УсеКП(б) правільная, але «як-бы не перагнуць палкі, як-бы чаго ня вышла».

Само сабой разумеецца, таварышы, што пастанову Цэнтральнага камітэту трэба правільна правесьці, як гэта належыць бальшавікам. А правільнае правядзеньне гэтай пастановы заключаецца ў тым, каб мы з усёй бальшавіцкай выразнасьцю і рашучасьцю выкрылі сапраўдныя прычыны і сапраўдныя памылкі, ня звальваючы іх на каго-небудзь другога.

Калі мы гаворым аб памылках партыйнай арганізацыі Беларусі (паўтараю, гэта датычыць і раённых, і цэнтральных арганізацый), то галоўнай памылкай было спазьненьне ў прыняцьці рашучых бальшавіцкіх мер барацьбы супроць тых апартуністычных самацёчных настрояў, якія стварыліся ў радах самой партыйнай арганізацыі і павялі да таго, што ня былі прыняты своечасовыя меры рашучай барацьбы супроць кулака, супроць кулацкага сабатажу загатовак, які ў поўнай частцы прасякнуў і ў аднаасобныя гаспадары, супроць тых перараджэнскіх гнілых элемэнтаў партыі, якія спрыяюць гэтаму кулацкаму сабатажу.

Трэба проста сказаць, што невялікія пляны па загатоўках, якія атрымала ў гэтым годзе Беларусь, былі ўспрыняты партыйнымі і савецкімі арганізацыямі, як пляны лёгка выканальныя і таму не патрабуючыя асаблівай барацьбы за іх выкананьне, што па сутнасьці зьяўлялася яркім выражэньнем апартуністычнай арыентоўкі на самацёк.

Мы выпусьцілі з-пад увагі абстаноўку ў разгортваньні палітычнага гаслю. Такія фактары ў барацьбе за выкананьне пляновых заданьняў, як зьніжэньне пляну загатовак і разгортваньне клясавага гаслю, аказаліся не ў выстарчальнай меры выкарыстанымі партыйнымі і савецкімі арганізацыямі.

Партарганізацыі ў сваёй прэтэнцыёзнай штодзённай рабоце на загатоўках невыстарчальна ўлічылі, што барацьба за разгортваньне гаслю павінна прахадзіць у непарыўнай сувязі з барацьбой за сваячасовае і поўнае выкананьне пляну дзяржаўных загатовак, у першую галаву з боку аднаасобнікаў.

Не сустракаючы выстарчальнага адпору з боку раду раённых і партыйных арганізацый, кулак і яго агентура вытлумачылі пастановы партыі аб калгасным гандлі і зьніжэньні пляну загатовак, як наша адступленьне, як прымушаную ўступку, тым самым усьцвердзіўшы на аднаасобніка і калгасьніка, захватваючы сваім разлагаючым уплывам пасобныя найменш устойлівыя элемэнты ў нашых сельскіх партыйных арганізацыях. У гэтых умовах аднаасобнік збожжа, бульбу, мяса і лён не прадаваў дзяржаве па ўстаноўленых цэнах, а лічыў за лепшае вывозіць на рынак і прадаць па спэкуляцыйных цэнах.

Там-жа, дзе партыйныя арганізацыі узяліся за работу, ня пусьцілі справы на самацёк, арганізавалі адпаведны націск і далі бязьлітасны адпор кулаку і яго агентуры, як гэта зрабіла Маскоўская арганізацыя, Татарыя,—пляны аказаліся выкананымі поўнасьцю і да тэрміну.

У нас-жа, у БССР, мы мелі і маем у радзе раёнаў выключна мяккацелыя, прытуленыя адносіны да кулака. У першую чаргу гэта датычыць тых раёнаў, дзе мы зьняслі кіраўніцтва. Толькі простым папушчэньнем кулаку можна вытлумачыць такія факты, як выкананьне цьвёрдых заданьняў па радзе раёнаў (па 10-ХІІ) на 10 і нават 1 з пал. процанта.

Пасьля таго, як мы падпатрэбнулі ў пытаньні аб кулаку, у радзе раёнаў атрымаўся разкі пералом. Возьмем Асіпавіцкі раён. Там выкананьне цьвёрдых заданьняў складае 115 проц., па Дрысенскім раёне—255 проц., па Пятрыкоўскім—113 проц., па Чырвонапольскім—150 проц. І гэта ў той час, калі па Чэрыкаўскім раёне мы мелі на 10 чысло 1 проц. выкананьня, па Ўраравіцкім раёне—1,2 проц., па Любаньскім—1,5 проц., па Веткаўскім—1,5 проц. і г. д.

Аб чым гавораць гэтыя лічбы? Яны гавораць аб тым, што ў гэтых раёнах ня ўдарылі па кулаку ў свой час, прыкрылі яго, а ў другіх раёнах і на сёньняшні дзень ня прынята поўнасьцю тых мер у адносінах да кулака, якія мы абавязаны да яго ўжыць, як да арганізатара сабатажу загатовак.

Сей-той з «камуністаў» пробуе знайсьці апраўданьне гэтым гніла-лібэральным адносінам да кулака і яго агентуры ў тым, што БССР знаходзіцца на межы і з гэтай прычыны, моў, трэба быць «надзвычай асьцярожнымі», як-бы по ўскладнець становішча, як-бы не разгарнуцца «сакэта шырока». У сапраўднасьці-ж прыведзенае становішча Беларусі ня толькі на зьмене з бальшавікоў абавязку і неабходнасьці змагацца з кулаком і яго агентурай, а, наадварот, патрабуе ад кампартыі Беларусі самага бязьлітаснага змаганьня з кулацкімі, антысавецкімі і перараджэнскімі элемэнтамі.

«Рабочыя і сяляне, працоўныя і эксплёатуемыя,—пісаў Ленін у 1918 г.,—зямля, банкі, фабрыкі, заводы перайшлі ва ўласнасьць усяго народу. Змагаецца семі за ўлік і кантроль вытворчасьці і размеркаваньня прадуктаў—у гэтым і толькі ў гэтым шлях да перамогі сацыялізму, зарука яго перамогі, зарука перамогі над усякай эксплёатацыяй, над усякай галечай і нуждай. Бо ў Расіі хопіць хлеба, жалезу, лесу, воўны, бавоўны і ільну на ўсіх, толькі-б правільна размеркаваць працу і прадукты, толькі-б устанавіць усенародны пазлік, практычны кантроль за гэтым размеркаваньнем, толькі-б перамагчы ня толькі ў палітыцы, але і ў штодзённым эканамічным жыцьці ворагаў народу: багатых, іх нахлебнікаў, пустых жулікаў, чужаедаў і хулігана ў».

«Ніякай літасьці да гэтых ворагаў народу, ворагаў сацыялізму, ворагаў працоўных. Вайна не на жыцьцё, а на сьмерць багатым і іх нахлебнікам»...

«Багатыя і жулікі, гэта—два бакі адной медалі, гэта—два галоўныя рэзервы, ускормленыя капіталізмам, гэта—галоўныя ворагі сацыялізму, гэтых ворагаў трэба ўзяць пад асаблівы нагляд усяго насельніцтва, з імі трэба распраўляцца пры малейшым парушэньні імі правіл і законаў сацыялістычнага грамадзтва, бязьлітасна. Усякая слабасьць, усякае хістаньне, сантыментальнічаньне ў гэтых адносінах было-б вялікарэйшым злачынствам перад сацыялізмам» (Ленін, том XXII, стар. 164—«Як арганізаваць спаборніцтва»).

Другая буйная памылка заключаецца ў неразумным, наўмысным змаганьні за канкрэтнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі не на словах, а на справе. Нашы раённыя камітэты і нават цэнтральныя арганізацыі вельмі часта выносяць пастановы, надзвычай блазкія па зместу, але не правяраюць іх, канкрэтна іх не правяраюць. Замест канкрэтнай і апэрацыйнай работы атрымліваецца на практыцы дэкларацыйнасьць, пустазьвонства, работа «вогулу».

Далей, у нас повыстарчальна разгорнута барацьба з гнілымі перараджэнскімі элемэнтамі, якія прыкрываюцца партыйным білетам; ня было выстарчальнай барацьбы з элемэнтамі, якія прыкрываюць сваю антысавецкую контр-рэвалюцыйную работу фальшыва-нацыянальным сьцягам.

Толькі тады, калі мы разгарнулі сапраўды бальшавіцкую барацьбу ў радзе лініі за справу загатовак, толькі тады калі мы высунулі рад патрабаваньняў перад раённымі і сельскімі партыйнымі арганізацыямі аб поўным і сваячасовым выкананьні абавязацельстваў перад дзяржавай,—мы пачалі выяўляць факты перараджэньства і буржуазнага нацыяналізму.

АБ ХОДЗЕ ЗАГАТОВАК ПА БССР

З дакладу тав. ГІКАЛО на сходзе менскага гарадзкога партыйнага актыву

У рэзае партарганізацый на гэтыя факты глядзелі праз пальцы, абмяжоўваліся абвяшчэньнем выгаў, але пакідалі гэтых перараджэньцаў камуністаў на адказных пастах, замест таго, каб на справе пазбавіць, як доны чалавек алюсіца да дарчэньняў партыі, бясьлітасна выганяючы з радоў партыі чужыя элементы.

Трэба проста сказаць, што барацьба з гэтыма перараджэньскімі элементамі ў партыі ня толькі ў рэзае, але і ў цэнтральных арганізацыях праходзіцца далёка не ў выстарчальай меры.

Нашай трэцяй пазыцыяй зьяўляецца тое, што мы на здолеі выстарчальна ўлічыць урокі вясны і лета гэтага году, каб з усёй рашучасьцю ачысьціць калгасы ад разлезных туды кулацкіх і антысавецкіх элементаў, ня здолеі як сьлед палажыць работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў; ня здолеі сапраўды па-бальшавіцку кіраваць калгасамі ў выкананьні іх дзяржаўных абавязкоўсьцяў, у арганізацыі працы, у іх выгодным рабоце, у разьмеркаваньні даходу; не зьясьнілі ў выстарчальнай ступені расгорнутая калгасная гаспадарка з выкананьнем калгасамі сваіх абавязкоўсьцяў перад дзяржавай.

На мясцах не ў выстарчальнай ступені ўлічылі, што «ня можа ня быць элементаў вялікай барацьбы ў калгасах, калі там ёсьць кулацтва ці пазбаўленцы, калі там ёсьць нават нескаторая варожасьць... ці нешта дзелка ці нават бандыцкі выгадзі

МЫ РЭЗКА АДСТАЛІ АД УСЕХ ІЛЬНАВОДЧЫХ РАЁНАЎ!

Маскоўская вобласьць завяршае выкананьне пляну, Заходняя вобласьць загатовіла звыш 70 проц. ільнавалакна, а БССР—усяго толькі 37,6 проц. свайго гадавога пляну

Удзесяцярыўшы тэмпы апрацоўкі і загатоўкі ільну, выканаць да 1-га студзеня ня менш 80 процантаў гадавога пляну!

НІЯКАЙ „ЧАРГОВАСЬЦІ!“ Змагацца адначасова і за збожжа, і за лён, і за бульбу, і за мяса!

Каштоўны вопыт перадавых калгасаў не скарыстаны

МСЬЦІСЛАЎЛЬ. (Наш кар.). Адсутнасьць належных захадаў па арганізацыі работы ў калгасных вытворчых брыгадах, адсутнасьць разгорнутай масавай растлумачальнай работы сярод адпаасобнікаў, адсутнасьць бальшавіцкай рашучасьці ў барацьбе з кулаком і яго агентурай прывялі да таго, што ў Мсьціслаўскім раёне на 20 сьнежня плян ільназагатовак быў выкананы толькі на 30,5 проц. На радзе селскіх саветаў (Шамаўскі, Расьнянскі, Татаричынскі і інш.) выкананьне пляну ільназагатовак не перавышае 10-15 проц. Нават з кулацка-заможных гаспадарак здрак спагнана ўсяго 8 проц. ільнавалакна.

Аб усім гэтым выразна сьведчаць матар'ялы з Дучынскага сельсавету. У калгасе імя Сталіна гэтага сельсавету ў рабоце па апрацоўцы ільну панує абязьлічка і самацёк. Рабочая сіла расстаўлена няплянава і таму поўнасьцю не выкарыстоўваецца. Брыгады на ільнапрацоўцы ня маюць пляну работ, ільнамялкі не нагружаны, маюць месца прагулы. Часта можна бачыць, як калгасьніцы ня вялочы работы, ходзяць з хаты ў хату, шукаюць вяго-небудзь з праўленьня калгасу, просяць забясьпечыць іх работай.

Ня так даўно ў калгасе меў месца наступны выпадак. Ударніца Сівярцова патрабавала ад праўленьня калгасу, каб аплата працы на ільнапрацоўцы вызначалася ў залежнасьці ад колькасьці і якасьці выпрацоўкі. Як ня дзіўна, аднак, прапанова тав. Сівярцовай пасабнымі членамі праўленьня (Натачаеў) была спаткана ў штыхі:

— Так ударніці не павінны гаварыць. Ты, Сівярцова, плеш кулацкую песьню...

Хіба ня ясна, што тут мы маем справу з кулацкай агентурай, хіба ня ясна, што Натачаеў выкарыстоўвае грубы заціск самакрытыкі, нахабную фальсыфікацыю дырэктыў партыі і ўраду толькі для таго, каб граць на руку клясаваму ворагу, каб сарваць работу па апрацоўцы і здачы ільну дзяржаве.

У раёне вельмі дрэнна пастаўлена перанясьненьне каштоўнага вопыту перадавых калгасаў у адстаючыя.

У калгасе «Новае жыцьцё», Старасельскага сельсавету, у рэзультаце таго, што была правільна расстаўлена рабочая сіла, што сушка і іншыя працэсы апрацоўкі ільну былі даручаны канкрэтным асобам, што поўны калгасьнік адказваў за арганізацыю адпраўкі апрацаванага ільну на прыёмачны пункт — плян ільназагатовак яшчэ 5-га сьнежня быў выкананы на 60 проц.

Не падлягае сумненьню, што пры належных адносінах да справы з боку райкому партыі, «Загатільну» і МТС такія рэзультаты, якія мае калгас «Новае жыцьцё», маглі быць ва ўсіх калгасах і вёсках раёну.

Гэта трэба ўлічыць. З—а.

Лён ёсьць, лён асядае ў калгасе

ДРЫСА. (Наш кар.). Дрысенскі раён, які мае ўсе магчымасьці для сваячасовай здачы ільну, далёка яшчэ ня выканаў сваіх абавязкаў перад дзяржавай (на 20 сьнежня здана 51.8 проц. ільнавалакна і 48,6 проц. ільнянога насеньня). Для характарыстыкі становішча ў раёне даволі прагледзець ход здачы ільну па асобных калгасах.

Возьмем калгас «Чырвоны пагранічнік». Здана толькі 8 цэнтн. ільнатрасты. Па пляну трэба здаць 390 цэнтн.

Ільнавалакна калгас ня здаў нават ні аднаго кілёграма.

Барацьба за якасьць трасты зусім не вядзецца. Сяўсныя ільняныя брыгады калгасьнікаў па сартаваньні трасты ня створаны.

Праўленьне калгасу, на чале з старшынёй Стубайлам апартуністычна бязьдзейнічае. Для таго, каб у бліжэйшыя дні поўнасьцю адвезьці трасту на ільназавод патрабуецца кожны дзень ня менш 10 фурманак. Стубайла шлялае толькі 5 і то нерэгулярна. Па прадмеры калгасьнікаў высылаць больш фурманак Стубайла адказвае «чорт ільну ня возьме, сёла вялікая, часу хопіць».

Старшыня калгасу «Зямляроб», Сардыцкага сельсавету, Гіруцкі, замест здачы ільну дзяржаве аддаў загад апрацаваць 5 асеяк ільнатрасты для патрэб калгасьнікаў.

Калі-ж перад Гіруцкім было пастаўлена пытаньне аб хутчэйшай адгрузцы ільнатрасты на ільназавод, ён заявіў:

«Я ў першую чаргу павінен забясьпечыць калгасьнікаў, а потым буду давыконваць плян».

На гэтым справа ня скончылася. І зараз гэты самы кулацкі агент крадзькам праціставіць інтарэсы калгасу, інтарэсам дзяржавы. Ільнатраста апрацоўваецца выключна для патрэб калгасу.

У калгасе «Прамень Парыскай Камуны» мы маем такое зьявішча. Ільнасеньне ня ўбрана і не абмалочана. Старшыня калгасу Чыган вельмі «заклапочан». Ён па цэлых днях занят паляваньнем на зайцаў.

Паказэнаму вышэй кулацкаму супраціўленьню і спажывецкім тэндэнцыям ня дае адпор як з боку партячэек і сельсаветаў, так і раённых арганізацый.

Дырэктар Вушацкага ільназаводу Стаховіч зьнят з работы

Патрабуем пры цягненьня яго да судовай адказнасьці

ВУШАЧЫ. (Па тэлеграфу ад нашага карэспондэнта). 21-га сьнежня «Зьвязда» сьцвердзіла аб дзейнасьці кляса-вага ворага і абурачых адносінах да ільназдатчыкаў на Вушацкім заводзе.

Гэтымі дамі завод наведаў намесьнік старшыні СНК БССР тав. Бэнзік і ваш спэцкор. Факты, паказаныя ў «Зьвязьдзе» пацьвердзіліся.

На заводзе дадаткова выяўлен рад злачынных адносін з боку адміністрацыі да ільназдатчыкаў і поўная безгаспадарчасьць. Лён на заводзе валяецца раскіданым. Кучы ільну, ня прынятага ад калгасаў, звалены на двары. Пажарная ахова адсутнічае.

24 сьнежня калгас «Чырвоны пуцілавец» прывёз за 15 клм. 7 фурманак трасты з нумарамі 0.5, 1 і 1.5. Прывезены лён быў не сартаваны. Завод адмовіўся прыняць гэты лён сярэднім нумарам. Толькі пад націскам спэцыяліста з Менску Эйнштэйна лён быў прынят нумарам 1.

Прычыны дастачкі заводу несартаванай трасты ў тым, што як з боку заводу, так і МТС ня было правезена ніякай растлумачальнай работы ў калгасах. Калгасы аб сартаванай трасты і стандартах, якія патрабуе завод, ня ведаюць. За ўвесь час з нязрынятым ільном было зьвернута 1.726 фурманак.

Бюракратычныя адносіны да здатчыкаў, масавае варочаньне фурманак з трастой— адна з прычын марудлага ходу ільназагатовак па Вушацкім раёне.

Дырэктар заводу Стаховіч распаражэньнем тав. Бэнзка з работы зьнят. Яму ня месца таксама і ў радах партыі. Стаховіч павінен адказаць за свае ўчынкі перад пралетарскім судом.

Мікуцкі.

Перадавікі выканалі плян

РАГАЧОЎ. Перадавыя сельсаветы раёну, на аснове правядзеньня масава-растлумачальнай работы, рашучага націску на кулацка-заможныя гаспадаркі поўнасьцю выканалі ільназагатоўкі.

Кісьцінеўскі сельсавет плян здачы ільнавалакна выканаў на 101.1 проц., канапель — 130 проц. Старасельскі сельсавет плян па ільнавалакне выканаў на 100 проц., па каноплях — 108 проц. Набліжаецца да выкананьня пляну і Сьвержанскі сельсавет. (БЕЛТА).

Прыёмка збожжа не арганізавана

ЧАВУСЫ. (Наш спэцкор).

Чавускі раён з самага пачатку збожжазагатоўчай кампаніі цягнецца ў тыле загатовак, ня гледзячы на значнае скарачэньне пляну ў параўнаньні з мінулым годам. На 24 сьнежня гадавы плян выкананы на 67.4 проц. (разам з насеньпазыкай). Калгасны сэктар яшчэ дагэтуль не завяршыў здачы збожжа, рэалізаваўшы заданьне на 94.3 проц.

Самым адсталым вучасткам зьяўляецца адпаасобны сэктар (60.4 проц.) і галоўным чынам, сваячасовае цьвёрдых заданьняў з кулацка-заможных гаспадарак (47.4 проц.).

Толькі за апошнія два тыдні Чавускі раён узяўся па-сапраўднаму за ліквідацыю прарыву. Раённыя арганізацыі накіравалі на месцы 80 чал. партыйнага і камсамольскага актыву. У сельсаветах мабілізаваны лепшыя калгасьнікі і перадавыя беднякі і сераднякі—адпаасобнікі.

Ужо ёсьць поўныя вынікі. Першым выканаў плян загатовак Самулкаўскі сельсавет (106 проц.). Гэтымі дамі рапартавалі аб завяршэньні кампаніі Халмоўскі сельсавет (100,5 проц.), Благаўскі (101,1 проц.), Чавускі гарсавет (100.5 проц.).

Гэтыя поспехі паказваюць, што плян збожжазагатовак па Чавускім раёне цалкам рэальны, што ўсе разважаньні аб адсутнасьці збожжа, аб неўраджаі і г. д. зьяўляюцца проста выдумкай кулацтва і яго агентуры, якія жадаюць сарваць загатоўкі.

Прычына адставаньня Чавускага раёну заключаецца ў слабай апэрацыйнай работе, у адсутнасьці націску на кулацка-заможныя гаспадаркі.

Некалькі характэрных фактаў. Упаўнаважаны РК і РВК тав. Майсеенка, замест таго, каб ехаць у сельсавет, кудысьці зьнік. Яго брыгада так і не пачала працаваць.

Сакратар камсамольскай ячэйкі Амхініцкага сельсавету Пузікаў ня толькі сам бязьдзейнічаў, але і размагнесваў іншых камсамольцаў, ён зусім ігнараваў збожжазагатоўкі.

У калгасе імя Дзяржынскага, Хацькаўскага сельсавету, сыстаматычна раскрадалі абмалочанае збожжа. Падчас выкрыты зладзеі Буянаў, Краўцоў, Хамяйкоў і інш. У гэтым-жа калгасе кулакамі і падкулачнікамі разбазарана 500 пудоў бульбы. У калгасе «Барэц», Сушкаўскага сельсавету, выкрыта сыстаматычнае раскраданьне збожжа і бульбы, прычым зладзеі утойкаў пралезьлы ў калгас кулак Мельнікаў.

У калгас «Цімахоўка», Сушкаўскага сельсавету, пралезьлі 4 кулакі, якія раней мелі па 40-60 га зямлі і карысталіся наёмнаю працай. Зараз гэтыя кулакі імкнуцца разваліць калгас, агітуюць калгасьнікаў супроць здачы збожжа дзяржаве. Гэты кулацкі сабатаж не сустракае адпору з боку сельсавету і раённых арганізацый.

Вельмі дрэнна арганізавана прыёмка на базах Загатбожжа. Прыёмчыкі не пасьпяшаюць за апошні час прымаць збожжа ад усіх здатчыкаў. На пунктах атрымаўся поўны затор. 19 сьнежня шмат сялян, не дачакаўшыся прыёмкі прадукцыі, вярнуліся назад у Антопаўскі сельсавет, ня здаўшы збожжа. Частка здатчыкаў з больш далёкіх сельсаветаў засталася начаваць пад адкрытым небам. У чым справа? Аказваецца, загадчык базы т. Яўсеенка, ведаючы, што 19 і 20 сьнежня будзе ўзмоцнены падвоз збожжа не распрадзіўся аб пашырэньні колькасьці вагаў і ліку прыёмчыкаў. Прадукцыю прымаў толькі адзін прыёмчык.

Л. Кустановіч.

ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

За ўзорныя тэмпы барацьбы за збожжа, за мабілізацыю мас калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў на ліквідацыю кулацкага сабатажу заносім на чырвоную дошку наступныя раёны:

1. **Тураўскі раён**—выканаў 106,1 проц. гадавога пляну,
2. **Жыткавіцкі раён**—выканаў 105,7 проц. заданьня,
3. **Вузьдзенскі раён**—101,8 проц. пляну,
4. **Намарынскі раён**—101,6 проц. заданьня,
5. **Слуцкі раён**—выканаў 100,1 проц. пляну,
6. **Менскі раён**—выканаў 100,1 проц. заданьня.

ТЭМПЫ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК ПА БССР

(У проц. да гадавога пляну разам з насеньпазыкай)

На 22 сьнежня	На 23 сьнежня	На 24 сьнежня
70,0	72,0	73,9

Вялікія магчымасьці і вялікае адставаньне

СЯННО. (Наш спэц. кар.).

Сенеенскі раён — гэта 16 буйных сельсаветаў, 240 калгасаў. Бяднацка-серадняцкія гаспадаркі раёну калектывізаваны на 65 проц. Партыйная арганізацыя даволі моцная і вялікая. Камсамольская арганізацыя налічвае ў сваіх радах каля 800 чалавек. У кожным найбольш буйным калгасе ёсьць камсамольская ячэйка. Раён мае сваю машына - трактарную станцыю, моцны калгасны актыў.

Усё гэта гаворыць за тое, што Сенеенскі раён мае ўсе магчымасьці сваячасова і поўнасьцю выканаць плян збожжазагатовак. Тым больш, што ў гэтым-годзе плян параўнаўча з мінулым годам скарочан. Усяго раён павінен здаць 900 тон збожжа.

І тым ня менш раён зьяўляецца адсталым у збожжазагатоўках. На 24 сьнежня плян выкананы усяго на 60 проц., а пасобныя сельсаветы — Расьнянскі, Сідарэнскі, Беліцкі, Аляксіяніцкі — загатовілі яшчэ менш (50—55 проц.).

Самым адсталым вучасткам зьяўляецца адпаасобны сэктар, які рэалізаваў свае заданьне на 46,7 проц. Аб тым, што ў раёне недаацэньваецца роля адпаасобніка, сьведчыць той факт, што асобныя сельсаветы фактычна амаль не распачалі загатовак сярод адпаасобнікаў. Так, Гарывецкі сельсавет загатовіў па адпаасобным сэктары... 8.5 проц. пляну, Сенеенскі гарсавет — 14 процантаў.

Ва ўсім раёне толькі на 2-х сельсаветах (Хачанскі і Застадольскі) поўнасьцю спагнаны цьвёрдыя заданьні з кулацка-заможных гаспадарак. Пераважная-ж большасьць сельсаветаў ліберальнічае з кулаком, не сьпяшаецца са спагнаньнем цьвёрдых заданьняў. Вось чаму апошнія спагнаны ў цэлым па раёне толькі на 51,9 процантаў. Па Аляксіяніцкім сельсавеце цьвёрдыя заданьні выкананы на 26 проц., па Немайцянскім — 20 проц. Гэтыя лічбы — вынік адсутнасьці націску на кулацка-заможныя гаспадаркі, адсутнасьці барацьбы з кулацкім сабатажам загатовак.

Ёсьць сабатажнікі загатовак і сярод пасобных кіраўнікоў сельсавету. Старшыня Беліцкага сельсавету Новікович ня раз выступаў на сходах супроць загатовак. Ён заяўляў: «заданьне не рэальнае, ня зможам выканаць». Прыкладу старшыні сьледвалі члены сельсавету Маднараў Рыгор, Бурда Антось, Бурда Рыгор, Прапаповіч Ягор. Яны ня толькі не мабілізавалі калгасьнікаў і працоўных адпаасобнікаў сваіх вучасткаў на выкананьне заданьняў па здачы збожжа, але самі ня выкапалі сваіх абавязкаў.

Такія-ж факты ёсьць і ў Расьнянскім і Аляксіяніцкім сельсаветах.

Партыйныя ячэйкі далёка ня ўсюды ўзначалілі барацьбу за збожжа. Беліцкая партячэйка (сакратар Міклушэў), Расьнянская (сакратар Бярговіч, Машчонская (сакратар Сінкевіч) і інш. не мабілізавалі свіх членаў, не расставілі сілы па асобных вучастках. Калгасны актыў у большасьці сельсаветаў ня прыняе ўдзелу ў загатоўках. У пасобных сельсаветах гэтым «актывам» круцюць кулакі. Так, у Бельскім сельсавеце, у в. Асінаўка слабодна арудуе кулак Шалкун Сымён, а старшыня сельсавету Павіковіч і сакратар партячэйкі спакойна назіраюць за разлагаючай работай клясавага ворага. Больш таго, за плячыма Навіковіча да апошняга часу хаваліся кулакі Макавецкі В., Матвеєў П., Марчанка М., Вялічка С. і інш. Старшыня сельсавету яўна патураў гэтым сабатажнікам цьвёрдых заданьняў.

Кіруючыя раённыя арганізацыі абавязаны неадкладна мабілізаваць усе сілы, усю энэргію на хутчэйшае і поўнае выкананьне пляну загатовак. Парагарганізацыя Сенеенчыны павінна паказаць, што яна на справе, а не на словах змагаецца за ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі.

В. СТАЛЬНОЎ.

Масавыя абозы з ільном

ЛЁЗНА. З прыездам у раён сакратара ЦК КП(б)Б тав. ШАРАНГОВІЧА значна ўзьняліся тэмпы ільназагатовак.

З раніцы да позьняй ночы ідуць масавыя абозы з трастой і валакном на прыёмачныя пункты. За два дні 19 і 20 сьнежня толькі адным ільназаводам імя Молатава загатоўлена 2.331 цэнтн. ільнатрасты.

У раёне зараз шырока разгорнута масавая работа. Увесь партыйна-камсамольскі актыў раёну мабілізаваны на скончаньне ільназагатовак да 1 студзеня. (БЕЛТА).

„БЯЗЬЛІТАСНАСЬЦЬ“ МАГІЛЕЎСКІХ СУДЗЬДЗЯЎ

МАГІЛЕЎ. (Наш спэц. кар.).

Магілеўскі раён — адзін з рашаючых збожжазагатоўчых раёнаў БССР. Раён павінен здаць у гэтым годзе 2.275 тон. збожжа (разам з насеньпазыкай).

Тэмпы збожжазагатовак па раёну, аднак, зусім нездавальняючыя. На 24 сьнежня гадавы плян выкананы толькі на 68,5 проц.

Аналіз прычын адставаньня раёну паказвае, што да апошняга часу раённыя арганізацыі і сельсаветы, ня гледзячы на выразныя дырэктывы партыі і ўраду, не разгарнулі бальшавіцкай барацьбы за збожжа, не арганізавалі рашучага адпору кулацкаму сабатажу загатовак. Больш таго, пасобныя члены сельсаветаў у тым ліку і камуністы проста патуралі клясаваму ворагу, дапамагалі кулацтву і яго агентуры зрываць загатоўкі. У Махаўскім сельсавеце некаторыя члены парт'ячэйкі зрасьліся з кулацка-заможнымі элемэнтамі, поўнасьцю сталі на шлях ашуканьня партыі і дзяржавы. У гэтым сельсавеце пад выглядам чырвоных абозаў былі арганізаваны масавыя абозы па вывазцы збожжа на прыватны рынак.

У Вышоўскім сельсавеце плян здачы збожжа выкананы толькі на 45 проц., насеньпазыка спагнана на 17 проц. Старшыня сельсавету БЫЧКОЎ адкрыта выступаў супроць здачы збожжа дзяржаве. Яго зьнялі з работы, але не прыцягнулі да адказнасьці за зрыў загатовак. Бычкоў спакойна працягвае сваю шкодную антысавецкую дзейнасьць.

Факты сабатажу загатовак з боку членаў сельсаветаў і камісій садзейнасьці мелі месца ў Гусьлішчанскім, Сьцяжарскім, Бранаўскім сельсаветах.

У Вендарэжкім сельсавеце сакратар партыйнай ячэйкі зрошся з кулацка-заможнымі элемэнтамі і адкрыта падтрымлівае кулацкую палітыку зрыву загатовак.

У Цішаўскім сельсавеце сакратар парт'ячэйкі фэрмы № 2 КРУМІН заяўляе: «Калі райкому патрэбна збожжа, няхай прыяжджае і бярэ, а загатаўляць ня буду». Гэты-ж кулацкі агент, калі да яго зьявілася буксірная брыгада, груба абляяў яе, назваўшы членаў брыгады зладзеямі і інш.

Раённы актыў яшчэ не мабілізован пабольшавіцку на правядзеньне загатовак. Ёсьць выпадкі, калі члены партыі з гарадзкога актыву адмаўляюцца выехаць у сельсаветы на дапамогу мясцовым арганізацыям. Дагэтуль амоць месца пібаральныя адносіны да апартуністаў з партбілетам у кішэні.

Як змагаецца за збожжа органы пракуратуры і суда Магілеўшчыны? Трэба проста сказаць, што пракуратура і суд не павялі непрымірымай барацьбы з кулацкім сабатажам збожжазагатовак, з тымі, хто патурае клясаварожым элемэнтам. Даволі сказаць, што за ўвесь час да судовай адказнасьці прыцягнуты толькі дзьве кулацкія гаспадаркі. З 78 прыцягнутых да суда заможнікаў, 28 або апраўданы, або прысуджены да зусім мізэрных штрафаў. Між тым кулакі злосна ня выконваюць цьвёрдых заданьняў. На 20 сьнежня, калі прайшло ўжо 3 месяцы пасьля сканчэньня тэрміну поўнага спагнаньня цьвёрдых заданьняў, епошнія выкананы толькі на 80 проц.

Пракуратура і суд ліберальна адносяцца да тых членаў сельсаветаў, якія самі ня выконваюць сваіх абавязкаў і вядуць агітацыю супроць загатовак. Аб гэтым з усёй выразнасьцю гаворыць той факт, што з 15 членаў сельсаветаў, прыцягнутых да адказнасьці за масавы сабатаж збожжазагатовак, 12 апраўданы. Гэта, па думцы пракуратуры і суда Магілеву, называецца «рашучымі мерамі» супроць кулацкага сабатажу.

Памольны збор у радзе млынаў раёну зпачынна разбазарваецца. Дырэктары саўгасаў і дзяржаўных млынаў, наперакор дырэктывам ураду, не здаюць сабранае збожжа дзяржаве, а затрымліваюць і разбазарваюць яго на месцы. Старшыня прамарцелі імя Сталіна (Дашкаўскі сельсавет), член КП(б)Б, за увесь час ня здаў ні аднаго кілеграму памольнага збору і схаваў у сябе звыш 12 тон збожжа. Як-жа рэагаваў суд на гэта злачынства. Ён прыгаварыў старшыню прамарцелі да... 6 месяцаў прымусовых работ.

У калгасе «Камінтэрн», Вендарэскага сельсавету, старшыня калгасу ВАСІЛЬЛЕЎ (член партыі) і загадчык складу ШПАКОЎСКІ раскралі 6.412 кгр. дзяржаўнага збожжа.

Дырэктар саўгасу «Дашкаўка», член партыі АКУЛЕНКА разбазарыў 6,978 кгр. памольнага збору і асуджан... на 6 месяцаў прымусовых работ. Па думцы нарсудзьдзі тав. ВІНЦА, гэта зьяўляецца «жорсткай» мерай да раскрадальнікаў дзяржаўнага збожжа.

Нарсуд і пракуратура не адкліканцца на патрабаваньні і сыпналы раённай газэты «Камунара Магілеўшчыны». 15 сьнежня газэта зьмясьціла цэлую старонку аб рабоце Махаўскага сельсавету і мясцовай парт'ячэйкі. Газэта патрабавала прыцягненьня злосных зрыўшчыкаў загатовак да судовай адказнасьці. У гэты-ж дзень на сходзе партактыву, раённы пракурор тав. ГІНЗБУРГ, заявіў: «Я сам быў у гэтым сельсавеце і выявіў, што ўсе факты, паказаныя ў «Камунары Магілеўшчыны» зусім правільныя». Здавалася-б, што пасьля гэтага пракуратура зробіць канкрэтныя арганізацыйныя вывады, але прайшло ўжо больш тыдню, а ні адзін пракурэнік сельсавету, ні адзін работнік ня прыцягнут да судовай адказнасьці.

Абураючае становішча з загатоўкамі БУЛЬБЫ. Па раёне плян выкананы на 72 проц. Дакладнага ўліку бульбазагатовак зараз няма, бо гэта справа пакінута на самацёк. Пасьля выкананьня пляну адгрузкі бульбы Ленінграду раённыя арганізацыі супакоіліся і спынілі кіраўніцтва бульбазагатоўкамі.

Дрэнна праходзіць таксацыя і загатоўкі ільну. Гадавы плян загатовак ільнавалакна выканан толькі на 32 проц.

Бюро РК КП(б)Б па прапанове сакратара ЦК тав. ЖАБРОЎСКАГА, вынесла рад канкрэтных пастаноў, накіраваных на неадкладнае ўзмацненьне тэмпаў загатовак, на сваячасовае выкананьне пляну.

Бюро райкому выключыла з партыі і аддала пад суд старшыню Вішоўскага сельсавету БЫЧКОВА, нам. старшыні Гусьлішчанскага сельсавету ШЫНІКАВА, сакратара Сьцяжарскага сельсавету СЕМКІНА, старшыню Махаўскага сельсавету ШАМІГА, нам. старшыні Махаўскага сельсавету ПАДРАБІННІКА, упаўнаважаных «Загатбожжа» КУЗЬНЯЦОВА і ЗАХАРЭНКУ.

Зьнят з работы і адданы пад суд старшыня Дрокаўскага сельсавету САЛДАЦЕНКА.

Выключан з партыі, як дэзэртыр загатоўчага фронту, раённы «актывіст» ЭСТЭРКІН, Брыгадзірам ЮДЭНСОНУ і ПАХОМАВУ, за нежаданьне выехаць у сельсавет абвешчана суровая вымова з папярэджаньнем.

Райком партыі мабілізаваў дадаткова на работу ў сельсаветы 30 чалавек. РК ЛКСМБ — 30 камсамольцаў. Апрача таго 30 камсамольцаў накіраваны ў адстаючыя Быхаўскі, Чавускі і Бялыніцкі раёны для дапамогі мясцовым арганізацыям у хутчэйшым завяршэньні загатовак.

Брыгада «Зьвязды»:
ДЖЭЛЮК, НЭЙДЛІН, АЛЕКСАНДРОВІЧ.

ЗДАВАЦЬ ШТОДЗЕННА Ў ЦЭНТНЭРАХ:

По збожжу:		По ільну:		По мясу:	
Ворша	1.088,	Гарадок	1.144,	Касьцюковічы	216,
Талочына	1.014,	Шклоў	974,	Жлобін	192,
Магілеў	948,	Мсьціслаўе	888,	Ворша	178,
Быхаў	867,	Дуброўна	840,	Рэчыца	161,
Чавусы	864,	Сянно	787,	Гомель	156,
Касьцюковічы	815,	Лёзна	736,	Полацак	155,
Рэчыца	714,	Сіроціна	717.	Клімавічы	155.
Бабруйск	668,				
Буда-Кашалёва	617.				

Гэтыя раёны, як вядучыя, павінны змагацца за перавыкананьне штодзенных заданьняў.

Галярэя ворагаў і здраднікаў

(Церахаўскі раён)

(Ад нашага спэц. карэспандэнта)

Становішча ў раёне доўгі час не зьмянялася. 12 дзён (да 22 сьнежня) не дали ні аднаго процанту прыросту ў галіне спагнаньня збожжа з кулацка-заможных гаспадарак. Лічба ў 47 проц. ужо трацюю пяцідзесяцю сыстаматычна запісваецца ў графе «выкананьне цьвёрдых заданьняў».

Гэта ў поўнай меры характарызуе работу партарганізацыі і загатоўчага апарату. Кулацкі сабатаж не зламаны. Пельга сказаць, каб партарганізацыя «ня ўжывала мер», не «змагалася». Але гэта змаганьне носіць характар пасыўнага супраціўленьня, канстатаваньня фактаў, у лепшым выпадку асуджэньня аднаго, ці двух кулакоў. І толькі...

Няма настойлівай, упартай, уласьцівай бальшавікам, барацьбы з кулацкім сабатажам. Няма арганізацыйна-масавай работы з калгасьнікамі і працоўнымі адпаасобнікамі. Работнікі раённых устаноў, якія выжджаюць на вёску, у сваёй рабоце не апіраюцца на калгасны бяднацка-серадняцкі актыў, і таму, іх праца ня носіць дзейнага характару і не дае патрэбных рэзультатаў.

Некаторыя работнікі раённых устаноў настроены дэмабілізацыйна. Яны, выпадкова трапіўшыя ў партыю людзі, на словах клянуцца ў вернасьці лініі партыі, а фактычна страцілі ўсялякае партыйна-клясавае пачуцьцё.

Дэзэртыраваць з фронту загатовак.—гэта значыць адмовіцца ад настойлівай, упартай барацьбы за збожжа, значыць дэманстраваць сваю нязгоду з палітыкай партыі, значыць зьвязаць свой лёс з клясава-варожымі элемэнтамі. Дырэктар Церахаўскага ільназаводу Равіковіч, які яшчэ зараз старанна хавае ў кішэні партыйны білет, рэгулярна плоціць членскія ўзносы, некалькі дзён назад быў накіраваны партыйным камітэтам на адзін з важнейшых вучасткаў загатовак.

Равіковіч не захацеў псаваць свае нэрвы, сварыцца з кулаком. Ён не паехаў на вёску. Ён паслаў замест сябе камсамольца. Застаецца толькі дадаць, што Равіковіч ня толькі не атрымаў спагнаньня, але ня быў нават запрошан у ячэйку, ці райком для «тлумачэньня».

Работа ўпаўнаважаных райкомаў і РВК на месцах не правяраецца. Равіковіч не адзін. Іншыя работнікі, якія фармальна згадзіліся выехаць на вёску, сваёй нерашучасьцю, мяккацеласьцю, ліберальнічаньнем з кулаком фактычна дапамагаюць сабатажу загатовак.

Значная частка вясковых партыйных ячэек барацьбу за збожжа падмяніе пустымі дэкларацыямі, якія нікога не абавязваюць.

Некаторыя пізавыя работнікі так навучыліся ашукваць партыю і ўладу, што дзіву даешся, дзе чалавек так аўладзеў мастацтвам «вітрать очки».

Вось сакратар Агароднія-Гомельскай парт'ячэйкі Рудзікаў. Экзэмпляр, якіх пашукаць трэба. Падарма кулакі і заможнікі называюць яго «сваім хлопцам». Ён і з кулакамі лазіць і ў райкоме лічыцца добрым работнікам.

Калі мы спыталі сакратара райкому тав. Сурбы, ці варта нам пад'ехаць у сельсавет, якім кіруе Рудзікаў, дык нам зусім сур'ёзна і пераканаўча заявілі:

— «Ня варта. Праўда, што там справы дрэнныя, але хлопцы змагаюцца, як ільвы».

Бачыце, якая высокая ацэнка! Паспрабуйце пашкапацца.

Рудзікаў і яго прыяцелі з Агароднія-Гомельскай ячэйкі — не такія дурні, каб лезьці на ражон. Калі трэба, Рудзікаў, пастукае сабе ў грудзі, паклянецца (у прыстутнасьці прадстаўнікоў раёну) у сваёй вернасьці генэральнай лініі, і нават пацісьне на кулака. Рудзікаў ня дрэнны стратэг і здольны тактык. Ён, калі трэба, ахвяруе якім-небудзь кулаком, каб набыць сабе шыльду і за ёй схаваць дзесяты іншых кулакоў і заможнікаў.

Спагнаў Рудзікаў для адводу вачэй 26 проц. цьвёрдых заданьняў і на гэтым паставіў крыжык.

— Што, мабыць пляны не рэальныя? — запытаецеся вы ў Рудзікава.

— Што вы, што вы, — заспакоіць ён вас, — зусім рэальныя, нават меншыя ў два разы, чым летась.

— У чыж-жа справа, збожжа няма?

— Ня можа ня быць—ёсьць!

— А чаму не ідзюць, у чым, нарэшце, справа?

Рудзікаў і тут знаходзіць адказ. Ён скажа вам, што збожжа ёсьць больш чым даволі, але вось суседзяе Украіны, але вось хаваюць збожжа, вывозяць яго. Ня ведаю, дзе хаваюць, а не пакажуць, не скажы, што злодзей. Ня варта, ды і ня правільна будзе караць невіннага чалавека.

Вось у аспоўным уся філёсофія Рудзікава. За маскай шчырага партыйца, хаваецца яўны кулацкі агент.

Тое, што кулак павінен здаць збожжа, а калі ён не здае, сабатуе, у яго трэба ўзяць збожжа — з гэтым зганяецца і Рудзікаў, гэта разумее і «ліцавы» камуніст старшыня сельсавету Чьмізаў. Але аз «разуменьня» да справы вялікая адлегласьць...

Для падзнаты карціны можна дадаць, што па Агароднія - Гомельскім сельсавеце плян збожжазагатовак выкананы на 33 процанты. Па іншых відах загатовак яшчэ менш. Можна яшчэ дадаць, што ў кожнага члена ячэйкі ад 5 да 10 сваякоў-заможнікаў. У масовай кампаніі, малочным таварыстве і інш. арганізацыях сядзяць таксама сваякі Рудзікава і Чыкізава, якія не шкадуюць сваіх сіл і энэргіі, каб снабжаць «патхніцеляў» кулацтва.

Рудзікаў не адзін... З ім перакідваецца сакратар Крупіцкай ячэйкі Галачонаў. Розьніца паміж ім і Рудзікавым у тым, што ён не пасьпеў яшчэ аўладаць усёй складанай тактыкай кулака, не пасьпеў схавацца за шырмай рэвалюцыйных фразы. Ён прымітыўна слухаць клясаваму ворагу.

— Збожжа ёсьць, а для загатовак няма.

Калі ў Галачонава запыталіся, што гэта значыць, як гэта зразумець, ён проста, бяз усякай філёсофіі адказаў:

— Мы павінны раней забясьпечыць сябе.

І ў Галачонава ў кішэні партыйны білет...

Калгасам імя Сталіна (Калініцкі сельсавет) кіруе апартуніст і абываталь Ермаленка. Цэрая фігура. Ён толькі і ведае, што сьледзім за заможнікамі, якія пралезьлі ў калгас, як папугай, хныча:

— Ох, цяжка, ох не магу, ох ня вытрымаю... Няма пшаніцы, няма аўса...

Стогне і ні грама не здае. Зрабілі сякую-такую паверхоўную праверку і знайшлі жыта столькі, што яго хапіла-б калгасу на гады тры.

Зусім не зразумела толькі, як Ермаленку па сіле такі цяжар, як партыйны білет.

Сакратар парт'ячэйкі калгасу «Селішча» Бурцоў крыху разумней за Ермаленку. Ён ня стогне, не крахціць, не скарыцца на сваю селюпку, ён проста разьмеркаваў усё збожжа, што меў калгас, сярод калгасьнікаў.

— Дзяржава і да новага году пачакаць можа, а нам зараз трэба — сказаў Бурцоў.

Вось дзе прычыны правалу са спагнаньнем цьвёрдых заданьняў з кулакоў і таго, што раён да 23 сьнежня здаў толькі 70,3 процантаў.

Яўна пэнысгарчальна змагаецца партыйны камітэт з ворагам, які носіць партбілет у кішэні.

Ул. МЯЖЭВІЧ.

ГАЛОДНЫЯ ВЫСТУПЛЕНЬНІ БЕСПРАЦОЎНЫХ У ГЕРМАНІІ

ВЭРЛІН, 23 У Бэрліне і на правінцыі адбываюцца антыкалядныя выступленьні галадаючых беспрацоўных, якія суправаджаюцца сутычкамі з паліцыяй.

У Бэрліне сёньня беспрацоўныя разьбілі шыбы ў вітрынах харчовага магазыну і пракавалі захапіць прадукты. Выкліканая паліцыя адкрыла стрэляніну па беспрацоўных. Адзін дэманстрант арыштован. Бурны характар прынялі выступленьні беспрацоўных у Рурскай вобласьці. У Вупэртале хвалявані беспрацоўных працягваліся каля двух дзён. У часе сутычкі беспрацоўных з паліцыяй было пяжка паранена два паліцэйскіх. На некаторых вуліцах беспрацоўныя вырывалі з бруку каменьні і імі абараняліся ад паліцыі. У другіх месцах беспрацоўнымі былі разьбіты ліхтары, з прычыны чаго вуліцы патрулініся ў цемру. У часе разгону дэманстрацый беспрацоўных паліцыя парашила трох чалавек. У Дуісбургу, Мангэйму, Гамборне, Вальзуме, Мойзерсе і Пфэйштадце масы беспрацоўных прабавалі захапіць харчовыя магазыны.

Дэманстрацыя беспрацоўных адбылася таксама ў Дортмундзе. Адбылася вострая сутычка беспрацоўных з паліцыяй, у часе якой быў паранен паліцэйскі вахмістр.

У Кобленцы паліцыя адкрыла стрэляніну па дэманстрацыі беспрацоўных. 12 дэманстрантаў арыштавана. У Бремене адбыліся дэманстрацыі беспрацоўных у знак пратэсту супроць апуляваньня брэмскім сэнатам пастановы муніцыпалітэту аб выдачы зімовай дапамогі. На гледзячы на выступленьні ўзмоцненых атрадаў паліцыі, дэманстрацыі адбываліся да позьняй ночы (ТАСС).

ЗАКАНЧЭНЬНЕ СЭСІІ БЮРО АНТЫВАЕННАГА КАМІТЭТУ

ПАРЫЖ, 24. Сёньня скончылася сэсія бюро камітэту барацьбы супроць імпэрыялістычнай вайны.

Бюро аднагалосна ўхваліла рэзалюцыі: 1) Аб плане бліжэйшых работ камітэту; 2) аб стварэньні сусьветнай прафсаюзнай камісіі, якая павінна будзе намеціць шляхі і сродкі барацьбы супроць імпэрыялістычнай вайны на прадпрыемствах і сярод рабочых, арганізаваных у прафсаюзы, і 3) аб адкрыцьці міжнароднай падпіскі на 1 млн. франкаў для барацьбы супроць імпэрыялістычнай вайны.

17-мільярдны дэфіцыт францускага бюджэту

ПАРЫЖ, 23. Агэнцтва Гавас паведамляе: «Міністар фінансаў Шэрон залічыў фінансавай камісіі палаты дэпутатаў, што ён патрабуе ад палаты дазволу на выпуск казначэйскіх бон на суму 5 млрд. франкаў. Шэрон апавіў дэфіцыт трох апошніх бюджэтаў Францыі ў 17 млрд. франкаў і дэфіцыт чыгунак—у 10 млрд. франкаў».

Разлажэньне ўрадавага блёку

ВАРШАВА, 23. Агэнцтва «Іскра» паведамляе, што галоўнае праўленьне саюзу легіянэраў, «Нова земя Любельска» вядзе прапаганду ўжо не на парэньні «ачышчаньня» ўрадавага блёку, а за выхад «усёй ідэйнай меншасьці» з блёку. Адтак заступаючы ўрадавы блёк, група адвачасова распарваецца перад урадам.

«Па адрасе ўраду мы пішэм папрокаў ня робім,—заяўляе «Нова земя Любельска».—Уся адказнасьць пакуль на кіруючы блёк, які поўнасьцю скампрамітаваў сябе і яго непадрыўнасьць уся грамадзянасьць».

Такім чынам, задача гэтай «апазыцыйнай» групоўкі—затрымаць прадпасылкі ня ўзнаных легіянэраў, процістаючы кіруючаму блёку, які разлажыўся, групу «ідэйна-чыстых прыхільнікаў ураду».

У сучасны момант, пад уплывам росту неспадзяваныя ізаных мас саюзу легіянэраў, «Нова земя Любельска» вядзе прапаганду ўжо не на парэньні «ачышчаньня» ўрадавага блёку, а за выхад «усёй ідэйнай меншасьці» з блёку. Адтак заступаючы ўрадавы блёк, група адвачасова распарваецца перад урадам.

«Па адрасе ўраду мы пішэм папрокаў ня робім,—заяўляе «Нова земя Любельска».—Уся адказнасьць пакуль на кіруючы блёк, які поўнасьцю скампрамітаваў сябе і яго непадрыўнасьць уся грамадзянасьць».

Такім чынам, задача гэтай «апазыцыйнай» групоўкі—затрымаць прадпасылкі ня ізаных легіянэраў, процістаючы кіруючаму блёку, які разлажыўся, групу «ідэйна-чыстых прыхільнікаў ураду».

Пад выглядам дапамогі—усеагульная вайсковая падрыхтоўка

БЭРЛІН, 24. Сёньня апублікавана адозва да германскага народу, падпісаная прэзыдэнтам Гінденбургам і райхсканцлерам Шлейхэрам з заклікам аб аказаньні дапамогі германскай моладзі.

Гэта дапамога павінна заключацца ў тым, што ўсе саюзы, таварыствы і арганізацыі, а таксама розныя аб'яднаньні беспрацоўных павінны арганізаваць для моладзі да 25-гадовага ўзросту чатырохгадзінныя «спартыўныя ці іншыя заняткі». За наведваньне і ўдзел у гэтых занятках удзельнікам будзе выдавацца гарачы абед, на які дзяржава асігнуе 1 марку і 20 пфэнігаў. Паводле рэстак прэсы, усяго на правядзеньне гэтай «барацьбы з галечай» будзе асігнавана каля 10 млн. марак.

«Ротэ Фаніэ» рэзка выступае супроць гэтага мерапрыемства ўраду, зазначаючы, што на сутнасьці гутарка ідзе аб усеагульнай вайсковай падрыхтоўцы, для чаго ўрад хоча скарыстаць галодных беспрацоўных, купіўшы іх за талерку супу.

У АБАРОНУ ПРАЦОЎНЫХ ПАЎНОЧНАЙ МАНЧЖУРЫІ

(Адозва ЦК Міжрабпоку да працоўных усяго сьвету)

У сувязі з катастрафічным становішчам працоўных мас у Паўночнай Манчжурыі, якое стварылася ў сувязі з акупацыяй Манчжурыі японскім імпэрыялізмам, а таксама паводкай, ЦК Міжрабпому зьвяртаўся да працоўных усяго сьвету з наступнай адозвай:

«Новая катастрофа абрушылася на насельніцтва Паўночнай Манчжурыі. Апрача жахаў вайны, апрача ўсіх выкліканых ёю нішчасьцяў, 10 млн. чалавек пацярпела ад паводкі, якая захапіла трэцюю частку тэрыторыі краіны. У самім Харбіне паводкай зьнішчана звыш тысячы дамоў, дзесяткі тысяч чалавек засталіся пад адкрытым небам. Сялянскі ўраджай загінуў, гандаль спыніўся, голад і эпідэмія халеры ўносяць у магілу тысячы людзей. Толькі ў адным горадзе Тунляо вольласьць загінуўшых ад халеры дасягнула па 3 жніўня 2 тыс. чалавек.

Японская сэкцыя Міжрабпому, якая праводзіла пятаўю кампанію дапамогі пацярпеўшым ад паводкі ў Паўночна-Усходняй Японіі і на востраве Хакеда, цяпер зноў працягвае сваю брацкую руку дапамогі рабочым і сялянам паўночнай Манчжурыі.

Сэкцыя разгарнула вялізарную кампанію дапамогі і зьвяртаецца за падтрыманьнем да міжнароднага пралетарыяту. Праз галовы ваюючых генэралаў, капіталістаў і буйных уласьнікаў Японіі гэты заклік накіраваны да сялянскіх мас Японіі і Кітаю. Адтак, акт салідарнасьці гарачых рабочых і сялян Кітаю не павінен абмежавацца гэтымі 2-мя краінамі.

ЦК Міжрабпому зьвяртаецца з заклікам да ўсіх рабочых і сялян Індыі, Карэі, усіх Ціха-акіянскіх краін Эўропы і Амэрыкі аб аказаньні дапамогі манчжурскім працоўным—ахвярам японскай вайны, якая прынесла з сабой разбурэньні ірыгацыйных пабудоў, зьнішчэньне плацін, вялізарныя лясныя пажары.

Абавязак сусьветнага пралетарыяту—ператварыць справу дапамогі ў гарачы пратэст супроць японскіх агрэсыўных выступленьняў супроць мірнага насельніцтва і стварыць рух, які павінен стаць магутнай дэманстрацыяй салідарнасьці ў адносінах да хвяр японскага імпэрыялізму і паводкі ў Паўночнай Манчжурыі.

Няхай жыве міжнародная рабочая салідарнасьць!

Сун Цзі-лін (Кітай), Анры Барбюс (Францыя), Клара Цэткін (Германія), граф. Дана (Злучаныя Штаты), Вільлі Мюнцэнбэрг (Германія).

(«Юманітэ» ад 19 сьнежня).

„ПАЦЫФІКАЦЫЯ" ПОЛЬСКІХ ВЁСАК

Рэдка можна знайсьці нумар газэт фашыскай Польшчы, кі-б ня было заметак аб самавольнай крывавай расправе паменчыкаў і іх служак — розных лясьнічых, экзэкутараў над батракамі, а таксама і наўкальнымі сялянствам.

— 10 лістапада бягучага году, у 3 гадз. дня трое лясьнічых затрымалі выехаўшую з панскага лесу сялянскую фурманку. Ян і Пётра Мураўскія везьлі струхлеўшы корч. Лясьнічыя загадалі братом завезьці гэты корч на край леса і там скінуць. Мураўскія, не спрачаючыся выканалі гэты загад, сказалі сваё прозьвішча, хатні адрас і хацелі ехаць дамоў, але лясьнічыя сілай затрымалі каня з возам. Усе спробы адпаць каня, не далі ніякіх вынікаў. Лясьнічыя былі няўмольныя.

Але для ланцужных сабак пана гэтага было мала. Адзін з лясьнікоў — Вось павярнуў тварам да сябе стаяўшага побач Пётра Муравецкага, адступіў тры кроку і ва ўпор стрэліў проста ў грудзі. Пётра Муравецкі ўпаў мёртвым. Разьюшаны пёс пана пасьля гэтага стрэліў другі раз у другога Муравецкага, але куля праляцела міма. Усё гэта рабілася на вачох двух іншых сялян Язэпа Гражкі і Юліяна Дзюрскага з тэй-жа вёскі Далешыц. Яны кінуліся было ратаваць сьцякаючага крывёю на зямлі Пётру Муравецкага, але лясьнічы Вось прыгразіў ім расстрэлам. Янку Муравецкага Вось з вінтоўкай напагатове адправіў у бліжэйшы паліцэйскі вучастак.

Сяляне патрабавалі арышту Вося, але камэндант паліцыі ня толькі не арыштаваў, але нават не адабраў ад яго вінтоўкі. Гэта яшчэ больш абурыла сялян. Натоўп стаў напіраць на паліцэйскіх, катэгарычна патрабуючы выдачы Вося. На каманду паліцэйскіх разыйсьціся, сяляне адказалі градам каменьняў. Паліцэйскія далі некалькі залпаў па натоўпу. У результаце — забіты Юлія Фурманак — 16 год Вінцэнты Зэр — 20 год. Цяжка паранены Францішак Павелькевіч — 20 год і шмат лёгка параненых.

Расстрэл сялян выклікаў вялізарнае абурэньне і абазьлоньне апошніх. У адзін момант зьляцелася ўся вёска. У паліцыю пасыпаліся каменьні і ўсё, што попала. Пад націскам атакуючага натоўпу, паліцыя разам з лясьнічымі ўцякла ў лес. Увесь час іх прасьледвалі сяляне. На дапамогу паліцэйскім у 12 гадз. уначы з Келец прыбылі новыя атрады паліцыі. Пачаліся масавыя аблавы і арышты сялян. За ноч было арыштавана звыш 80 чал.

Адзіны рабочы фронт можа і павінен быць створан толькі зьнізу

З прамовы тав. Швэрніка на бюро антываеннага камітэту

ПАРЫЖ, 24. На ўчарайшым пасяджэньні бюро сусьветнага камітэту барацьбы супроць імпэрыялістычнай вайны выступалі пралетаўнікі розных краін.

Катаяма (Японія) указвае на зьмены ў сусьветнай абстаноўцы, на захват Японіяй Манчжурыі, на апэрацыі Англіі ў Тыбэце, на барацьбу манчжурскіх сялян з японскімі імпэрыялістамі.

Пачынаючы з 1920 г. Японія арыштавала 20 тыс. рабочых. 60 камуністаў замучаны ў японскіх турмах. «Тым ня менш,—заяўляе Катаяма,—барацьба японскага пралетарыяту пашыраецца».

Міто, японскі дэлегат, марак, канстатуе шматлікія прыклады адмаўленьня маракоў розных краін грузіць амуніцыю. Ён у сваёй прамове дамагаецца ўзмацненьня антываеннай работы сярод маракоў.

Казабон ад імя францускай аўтаномнай федэрацыі дзяржаўных служачых, якая ясчае 40 тыс. членаў, заяўляе, што зьезд федэрацыі пастанавіў далучыцца да пастаноў Амстэрдамскага антываеннага кангрэсу.

Ад імя савецкай дэлегацыі выступае тав. Швэрнік.

«Рабочая кляса ў СССР,—гаворыць ён,—выкананьнем пяцігодкі ўмацавала пазыцыі сусьветнага пралетарыяту ў барацьбе з пагрозай імпэрыялістычнай вайны. Гэтыя пагрозы—заяўляе Швэрнік,—ня зьніклі. Заключэньне пактаў аб ненападзе не азначае, што небясьпека вайны зьнікла». Указаўшы на рост узбраеньняў у капіталістычных краінах, на работу генэральных штабаў па стварэньні новых груповак краін у прадбачаньні будучых ваенных канфліктаў і на агульнае абвастрэньне капіталістычных супярэчнасьцяй, тав. Швэрнік заяўляе: «Эўропа ідзе да новай вайны, яна блізка і трэба рыхтавацца да дзеяньняў».

Спыняючыся на тактыцы адзінага рабочага фронту, тав. Швэрнік заяўляе, што трапанова сацыял-фашыстскіх і рэфармісцкіх лідэраў аб простых перагаворах паміж лідэрамі Амстэрдамскага інтэрнацыяналу і Прафінтэрнам не падыходзіць. Адзіны рабочы фронт можа і павінен быць створан толькі зьнізу.

Сацыялістычныя правадыры гавораць за раз аб адзіным фронце толькі таму, што гэта ідэя шырока ўспрымаецца рабочымі масамі. Іх, сацыялістычных правадыроў, задача заключаецца іменна ў тым, каб асла біць імкненьні рабочых мас да барацьбы адзіным фронтам зьнізу за непасрэдныя патрабаваньні пралетарыяту супроць імпэрыялістычнай вайны і ў абарону СССР.

Значны рост эпідэмічных хвароб у Польшчы

ВАРШАВА, 20. Лодзінская «Рэспубліка» ў справаздачы па зьезьдзе загадчыкаў аддзелаў аховы здароўя і сацыяльнай апекі ўсіх польскіх ваяводзтваў, які гэтымі днямі адбыўся ў Варшаве, піша: «Самай грозный небясьпекай зьяўляецца значны рост эпідэмічных хвароб. Заразьлівыя хваробы,—піша газэта,—пашыраюцца са страшэннай шпаркасьцю, што знаходзіцца ў непасрэднай сувязі з пануючай зараз галечай шырокіх мас насельніцтва і беспрацоўя. Ва ўсходніх ваяводзтвах,—пакрысьлівалася на зьезьдзе,—пануе сыпны тыфус, у цэнтральных—брушны тыфус, шкарлятына і дыфтэрыт. Эпідэмія ня спыніліся нават з наступленьнем зімы».

Выступаючы па пытаньні аб дапамозе беспрацоўным міністар Губіцкі заявіў, што «непрадукцыйныя дапамогі будуць паступ ліквідаваны, а замест гэтага будуць уведзены мэтазгодныя, набудаваныя на гаспадарчых мерканьнях грамадзкія работы». Зьезд ухваліў пастанову, у якой указваецца, што дапамогі, якія атрымліваюцца ад дзяржавы, павінны быць адпрацаваны».

Папраўкі:

У пастанове СНК БССР і ЦК КП(б)Б пра загатоўкі масла, малака і сыру («Зьвязда», № 287 ад 25 сьнежня 1932 г.) у III групе раёнаў замест Сіроцінскага раёну павінен быць Сураскі.

У гэтай-жа пастанове апошнія два радкі 14 параграфу трэба чытаць: «Устанавіць план па паасобных саўгасах у раённым і месячным разрэзе».

— У дакладзе т. Галавеса, апошнім разьдзеле «Па-бальшавіцку змагацца за выкананьне пастаноў пленуму», у 3-м абзацы ў шостым радку замест слова «сустрэчная» трэба чытаць «сустаўная».

— У пастанове прэзыдыуму ЦКК аб справе Малярэвіча («Зьвязда», № 285 ад 23-XII—32 г.) надрукавана: «Правераком ЦК пастанавіў», а павінна быць: «Прэзыдыум ЦКК пастанавіў».

У часопісі «За ленінскую вучобу» № 6-7 у разьдзеле літаратуры, якая рэкамэндуецца для заданьня «Партыі ў гады рэакцыі і новага ўздыму» на старонцы 66, дапушчана памылка. Надрукавана: Троцкі «Аб Леніне і ленінізме»—зборнік пад рэдакц. Сафарова. Трэба чытаць: «Зборнік пад рэдакц. Сафарова «Троцкі аб Леніне і ленінізме».

Рэдакцыя часопісі «За ленінскую вучобу».

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

ПАМЯШКАНЬНЕ Польскага дзяржаўнага ТЭАТРУ (САВЕЦКАЯ, 28, ТЕЛ. 21-812)

6 СТУДЗЕНЯ адкрыцьцё ЗІМНЯГА СЭЗОНУ

ЭСТРАДНАГА ТЭАТРУ

У праграме лепшыя цыркавыя і эстрадныя нумары.

ПАДРАБЯЗНАСЬЦІ Ў АФІШАХ.

На спэктаклі эстраднага тэатру выпушчаны ў продаж абанэмэнтныя кніжкі, па якіх будуць адпускацца білеты са скідкай у 40 проц. Абанэмэнты распаўсюджваюцца пра фабзаўмясцкомы, а таксама прадаюцца ў рабочай касе. Падрабязнасьці—па тэлеф. 8-24 і 21-812.

Бел ДАМЕЦ.

ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Каса—ад 12 гадзін. Гучны мастацкі фільм СУСТРЭЧНЫ

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ Каса—ад 12 г. дня. Замежны мастацкі фільм Пасынкі Бэрліну. Звыш праго.—кіно-хроніка

Пралетарый: ВЫСПА ТОГУЙ драма ў 6 частках. Дзённыя дзіцячыя сэансы ПЕРШАЯ КОННАЯ

СПАРТАК Каса—ад 1-ш дня. Выдатны фільм Трыпольская трагедыя трагедыя ў 7 частках.

10-ы ДЗЯРЖЗЬВЯРЫНЕЦ ПРЫБЫЎ НОВЫ ТРАНСПАРТ мышэй і птушак. Зьвярынец адкрыт з 9 гадз. раніцы да 11 гадз. вечара штодзённа. Па калектыўных замоўках прадстаўляецца 50 проц. скідка. Зварачацца ў кантору зьвярынцу загазэта.

АНОНС! гэтымі днямі АДКРЫВАЕЦЦА першы ў Беларусі дзіцячы кіно-тэатр „Юны піянэр", Савецкая, 90 (памяшканьне былой кірхі)

ІНСТЫТУТ ГЕАЛЁГІІ Беларускай Акадэміі Навук заяўкі і гідрогеалёгічныя абсьледы ў 1933 годзе прымаюцца ім да 1-га лютага 1933 г., да якога тэрміну яны павінны быць аформлены дагаварамі. Заяўкі належыць накіроўваць па адрасе: Менск, Ленінская вул, д. № 29.35. Дырэкцыя.

СА СЬНЕЖНЯ месяца 1932 г. ВЫПУСКАЕЦЦА 7-ая ЛЁТАРЭЯ АСОАВІЯХІМУ

Купляй і распаўсюджвай білеты 7-й лётарэі! Умацуй абарону краіны Б. Дзержа САВІЯХІМУ

РАБОЧЫ, РАБОТНІЦА! Купляючы білет 7-ай лётарэі, ты наносіш удар па спробах контрэвалюцыйнай інтэрвэнцыі супроць СССР.

ПРАЦОЎНЫ! Кожны рубель, укладзены табою ў 7-ю лётарэю Асавіяхіму, азначае набудову дзесяткаў вышэйшых і прамысловых школ, сотняў вучэбных пунктаў і ваенна-марскіх станцый, арганізацыю тысяч хімічных школ і курсаў.

ТЫ МОЖАШ ВЫЙГРАЦЬ: падарожжа вакол сьвету, па Эўропе, па СССР на самалёце, аўтамабіль, маторную лодку, трактар, вялёсіпед, сельска-гаспадарчыя прылады, палюўничую стрэльбу і г. г.

Усяго выйгрышаў 152.268 на суму 7.000.000 рублёў.

РАБОЧЫ, РАБОТНІЦА, КАЛГАСЬНІК, КАЛГАСЬНІЦА! Дапамагаючы правядзеньню 7-ай лётарэі, ты садзейнічаеш разгортаньню вайсковай вучобы сярод працоўных, тэхнічнаму аснашчэньню Асавіяхіму.

Мендзяржпрацашчадкаса № 16 у другі раз даводзіць да ведама грамадзян, якія ўнесьлі поўнасьцю ўзносы за ШВЭЙНЫЯ МАШЫНЫ, што яны павінны зьявіцца за атрыманьнем гэткіх на склад дзяржшвэймашыны (Інтэрнацыянальная, 5) не пазьней 29 сьнежня. Пасьля гэтага тэрміну машыны не выдаюцца і прэтэнзіі на атрыманьне іх прымацца ня будуць. Мендзяржпрацашчадкаса № 16.

Менгарстрахкаса абвяшчае перарэгістрацыю ўсіх страхавацеляў гор. Менску і раёну (апрача наймальнікаў хатніх прадпрыемстваў). Перарэгістрацыя будзе праводзіцца з 26-га па 4-га сьнежня г.г. ад 9 да 15 гадзін у пакоі № 14. Чырвонаармейская 10. Усе наймальнікі, прадпрыемствы, дзяржаўныя установы, лекавыя і навучальныя установы, прафэсіянальныя, грамадзкія і жаўпрацыйныя арганізацыі, прыватныя асобы і іншыя (апрача наймальнікаў хатніх працаўніцкіх укладаюць наймовую раб. сілу і знаходзяцца на самастойным балансе або каштарысе) павінны прысылаць сваіх прадстаўнікоў у указаныя вышэй дні ў страхкасу за атрыманьнем бланкаў рэгістрацыі і не пазьней 31-XII вывярнуць іх запоўненымі страхкасе. За ўкараненьне ад перарэгістрацыі, ініцыятыя будуць прыцягнуты да адміністрацыйнай або крымінальнай адказнасьці. МЕНГАРСТРАХКАСА.

У аддзел аб'яў званеце па тэлефону 7-81

Пагрэбен сакратар-машыністка, пожадана са сваёй машынкай, культпрофу Мас. ГК КП(б)Б (пакоі 24) вул. К. Маркса.

Менскай рэспубліканскай 2-гадовай бібліятэчнай школе

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ. СЭКТАР КНІГАГАНДЛЮ.

ЛІТАРАТУРА ДА „ДНЯ УДАРНІКА" (1-I 1933 г.)

ЗА ЎДАРНУЮ РАБОТУ! ЗА САЦ. МЭТАДЫ ПРАЦЫ!
ЛЕНІН. Аб працоўнай дысцыпліне. 1932 г. ц. 20 к.
ЛЕНІН і СТАЛІН аб сац. спаборніцтве 1932 г. — ц. 25 к.
АМОСАЎ. Транспарт—на рэйкі ўдарніцтва. 1931 г. — ц. 10 к.
ОБУХАЎ. Барацьба за прац. дысцыпліну на аўтатранспарце. 1931 г. — ц. 40 к.
ОБУХАЎ. За прац. дысцыпліну на транспарце. 1931 г. — ц. 35 к.
ПАМЯТКА ЎДАРНІКА фінансавага фронту. 1931 г. — ц. 40 к.
ПАЎЛАЎ. За сацыялістычную арганізацыю працы. 1931 г. — ц. 35 к.
РЫХТЭР. Як арганізаваць улік сац. спаборніцтва і ўдарніцтва. 1931 г. — ц. 30 к.
САВІЧАЎ. Як арганізаваць ударную брыгаду. 1931 г. ц. 05 к.
САЦ. СПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА Ў ДЗЕЯНЬНІ (Мастацкія нарысы)
БРАДОЦКІ. З лініі агня. 10 дзён на вытворчых мэтэорах. (Нарысы). 1931 г.—ц. 15 к.
БРАДОЦКІ. Сьцяганосцы. (Кніга нарысаў). 1932 г. — ц. 60 к.
ВЕРНЫ ЦІШКА. Сымфонія гераічных будняў. 1932 г. — ц. 80 к.
ГОЛЬДЭНБЭРГ. Укараненьне заводу 1932 г. —ц. 25 к.
МАРКІ і БРАНШТЭЙН. Энтузіясты прыпаўка. 1931 г. — ц. 15 к.
МАРКОЎСКІ. Паравоз ОЧ-4631 (Нарыс). 1932 г. — ц. 25 к.
ПЕРВЕНЦЫ ПЯЦІГОДКІ. 1932 г. — ц. 65 к.
САДОЎСКІ. 10 дзён. яшчэ прынесьлі перамогу цэхам (Вытворчыя мэтэоры). 1931 г.— ц. 07 к.
САДОЎСКІ. Рукамі ўдарнікаў. 1932 г. — ц. 25 к.
УДАРНІКІ. Зборнік. 1931 г. — ц. 75 к.
ГЕРОІКА ПРАЦЫ Ў МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ
АНАНЬЕЎ ПАЎЛЮК. Героіка дзён. 1932 г. — ц. 55 к.
ЖУК АЎГЕН. Турбіны гудуць. 1931 г — ц. 15 к.
ЗАРЭЧНЫ І ЛІХАДЗІЕЎСКІ. Паэма пра геройства 1932 г. — ц. 15 к.
КАЗЛОЎСКІ. Музыка працы. (Паэзія). 1932 г. — ц. 1 р. 70 к.
РОЗЭНБЭРГ Энтузіясты працы. 1930 г. — ц. 10 к.
РЭЙН. Патомственны пралетары. 1931 г. — ц. 15 к.
СКРЫГАН. Права на оптузіязм. 1932 г. — ц. 40 к.
ХВЕДАРОВІЧ. Тэмпы—кантрасты. 1931 г.— ц. 1 р. 25 к.
РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫЯ ВЫТВОРЧАСЬЦІ. БАРАЦЬБА ЗА ЯКАСЬЦЬ
ВАЖАНАВА. Новае ў работе вытворчых нарад. 1931 г. ц. 15 к.
БАТУРСКІ. Вытворчыя нарады ў прамысловасьці. 1932 г.—ц. 30 к.
БРОЎЧАНКА. Новыя шляхі вытворчых нарад. 1931 г. — ц. 10 к.
БУРДЗЕНАЎ. За бальшавіцкую рацыяналізацыю! 1931 г. ц. 60 к.
БУРДЗЯНСКІ. Асновы рацыяналізацыі вытворчасьці. 1931 г. ц. 1 р. 70 к.
ВІКІН. За змаганьне за якасьць прадукцыі. 1931 г. — ц. 15 к.
ГУРАЎ. За тэхнічны плян. 1932 г.—ц. 50 к.
ДАНІЛЕВІЧ. Рацыяналізацыя і змаганьне са стратамі на вытворчасьці. 1931 г.—ц. 30 к.
КАНТАРОВІЧ. Чатырохбрыгадны графік. 1932 г. — ц. 10 к.
РОБІНАЎ. Што такое стандартызацыя. 1930 г. — ц. 20 к.
ЗА 6 УМОЎ т. СТАЛІНА!
СТАЛІН. Новая абстаноўка — новыя задачы гаспадарчага будаўніцтва. 1932 г. ц. 1 р. (Мініятурны фармат, у калінкорав. пер.).
СТАЛІН. Новая абстаноўка — новыя задачы гаспадарчага будаўніцтва. (Выд. III). 1932 г. — ц. 15 к.
ЛЕЙБМАН. 6 умоў т. Сталіна — гарантыя перамогі. 1932 г. — ц. 20 к.
ЛЕЦЦНЭР. Прыклад і выклік. (Завод «Беларусь» у барацьбе за другую ўмову т. Сталіна). 1932 г. ц. 25 к.
МАЛАШЭНКА. Новы цэх варашылаўцаў 1931 г. ц. 07 к.
СЕВЕРНЫ. У баёх за пасьпяховы цэх харчаваньня. 1931 г. ц. 10 к.
ТОСАДНІКАЎ. Рабочыя рукі—сац. будаўніцтву. 1931 г. ц. 05 к.
Важнейшыя задачы ў галіне працы. 1932 г. ц. 35 к.
АБ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДЦЫ
АБ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДЦЫ БССР. Пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б. 1932 г. ц. 07 к.
АРГАНІЗУЕМ СУСТРЭЧУ ПЯЦІГОДКІ пабудовы сацыялізму. 1932 г. ц. 20 к.
ДЫРЭКТЫВЫ ДА СКЛАДАНЬНЯ ДРУГОГА ПЯЦІГАДОВАГА ПЛЯНУ народнай гаспадаркі БССР (1933-1937 г.г.). 1932 г. ц. 30 к.
КОСАРАЎ і САЛТАНАЎ. На рубежы двух пяцігодак. (Даклады і рэзалюцыі). 1932 г. ц. 40 к.
ЛЯОНЦЬЕЎ. Другая пяцігодка. 1932 г ц. 20 к.
МОЛАТАЎ і КУЙБЫШАЎ. Аб другой пяцігодцы. 1932 г. ц. 37 к.
Класавая барацьба ў другой пяцігодцы. 1932 г. ц. 25 к.
НА ПАДСТУПАХ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ. 1932 г. ц. 35 к.
ЗА ТЭХНІКУ! (Значэньне тэхнікі, тэхпрапаганда)
АСІНСКІ. Тэхніка і рабочая кляса. 1931 г. ц. 35 к.
БАЙТАЛЬСКІ. Тэхніка рашае ўсё. 1932 г. ц. 60 к.
БУРДЗЯНСКІ. Шляхі бальшавіцкага аўладаньня тэхнікаю. 1932 г. ц. 40 к.
ГРЫНБЭРГ. Тэхнічны бой 1931 г. ц. 14 к.
ГУРОЎ. За тэхнічны плян 1932 г. ц. 50 к.
ЛЯШЭВІЧ. Парады маладому тэхніку. 1931 г. ц. 35 к.
МАБІЛІЗУЕМ НА ФРОНТ тэхнікі піянорскія батальёны. 1931 г. ц. 10 к.
НІСЭНБАУМ. Прапаганда тэхнікі ў палітасьветнай работе. 1932 г. ц. 55 к.
ПЯТРОЎСКІ. У змаганьні за тэхнічныя кадры. 1931 г. ц. 15 к.
ПЯТУХОЎ. За ўсеагульнае тэхнічнае навучаньне ўдарнікаў 1932 г. ц. 10 к.
РУБІНЧЫК. Базавыя задачы тэхпрапаганды. 1931 г. ц. 50 к.
РУБІНШТЭЙН. Маркс аб развіцьці тэхнікі. 1932 г. ц. 15 к.
РУБІНШТЭЙН. Навука, тэхніка і эканоміка ў Сав. Саюзе і ў капіталіст. краінах. 1932 г. ц. 35 к.
РУЗАЎ. Камсамол за аўладаньне тэхнікай. 1932 г. ц. 15 к.

ЗА АЎЛАДАНЬНЕ ТЭХНІКАЙ ВЫТВОРЧАСЬЦІ!
(Вытворчая літаратура)
АГУЛЬНАЯ ТЭХНІЧНА-ВЫТВОРЧАЯ ЛІТ-РА
НІКОЛЬСКІ. (Інж.). Тэхніка бясьпечнасьці працы. 1930 г. ц. 15 к.
НІЧАЕЎ. Ачышчэньне адпрацаванага смазачнага масла. 1932 г. ц. 20 к.
ТРАХІМАЎ. Малады памочнік машыніста. 1930 г. ц. 50 к.
ФАДЗЕЕЎ. (Інж.). Элемэнтарная мэханіка. 1930 г. ц. 2 р. 75 к.
Б-КА РАБОЧАГА-МЭТАЛІСТА
АРАНОВІЧ Ліцьцё пад націскам. 1931 г. ц. 40 к.
БУШ Е. Матэматыка фрэзэроўшчыка. 1932 г. ц. 2 р 35 к. пер. 25 к.
БЕСПРАЗВАНЫ. Што трэба ведаць рабочаму сьвідроўшчыку аб сваім станку. 1931 г. ц. 55 к.
ДОЛМЕНЦЕВА. Практыка сьлясарнай справы. 1931 г. ц. 65 к.
ЕВАНГУЛАЎ. (Праф.). Літаўленьне і ліўкаль не. 1932 г. ц. 60 к.
ЗАТОНСКІ. Токар па мэталю. (Практычны дапаможнік) 1932 г. ц. 1 р. 50 к.
КНІЖНІКАЎ. (Інж.). Цеплавая апрацоўка жалеза і сталі. 1931 г. ц. 80 к.
КАГАН Бальшарная справа, ч. 1. Разметка. 1932 г. ц. 2 р. 75 к.
КРАХАЛЁЎ. Агульны даклад за варштатам. 1932 г. ц. 20 к.
ЛЕВІН. (Інж.). Як зрабіць добры разец. 1932 г. ц. 45 к.
МАШКОЎ. Савецкі алюміні. 1932 г. ц. 50 к.
ПРЭГЕР Мэханічныя кавальскія малаты 1931 г. ц. 25 к.
Б-КА ЭЛЕКТРАТЭХНІКА
ВЫСЛОЎХ. Што такое турбіна. 1931 г. ц. 25 к.
ГЮНТЭР. Электратэхніка ўсім. 1932 г. ц. 3 р. 60 к. пер. 90 к.
ЖУКОЎСКІ. Дарачнік маладога электратэхніка. 1931 г. ц. 45 к.
МАНДЭЛЬШТАМ. (Інж.). Хваробы электрычных машын. 1931 г. ц. 85 к.
РУЦКІ. Асновы электратэхнікі. 1931 г ц. 1 р. 75 к.
ДРЭВААПРАЦОЎКА
ПРЭС (Інж.). Мэханічная апрацоўка дрэва 1932 г. ц. 1 р. 50 к. пер. 25 к
СІЛІН. Токарнае рамяство па дзераве. 1925 г ц. 15 к.
Б-КА РАБОЧАГА-ГАРБАРА
АРЭШКАЎ. Хемічныя матэрыялы скуранай вытворчасьці. 1932 г. ц. 1 р. 50 к.
ПЕСАРЭНКА. Выраб мастоўя 1932 г. ц. 1 р.
СКУРА. (Сэрыя «Па фабрыках і заводах»). 1930 г. ц. 25 к.
ПІЭР. Выраб клею і жэлятыны 1932 г. ц. 1 р. 25 к.
Б-КА БУДАЎНІКА
БЕКНЕЎ. Што павінен ведаць бэтоншчык. 1932 г. ц 1 р.
ЦЭМЭНТ. (Сэрыя «Па фабрыках і заводах»). 1930 г. ц 25 к.
ПАПЯРОВАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ
РОБІНАЎ. (Інж.). Што павінен ведаць рабочы пра папяровую прамысловасьць. 1931 ц. 50 к.
ВЫРАБ ШКЛА
КРУГЕР. Апрацоўка шкла. 1930 г ц. 20 к.
САВІЦКІ. (Інж.). Выпрацоўка шкла. 1932 г ц. 1 р.
ВЫРАБ ШТУЧНАГА ШОЎКУ
ШТУЧНЫ ШОЎК. 1931 г. ц. 32 к.
Б-КА ХАРЧАВІКА
ГНАТОЎСКІ. Задачы стандартызацыі харчовай прамысловасьці 1932 г. ц. 30 к.
ГУРЖІЯН. За будаўніцтва плодова-гародняй кансэрвовай прамысловасьці ў БССР. 1932 г. ц. 20 к.
ЛЮБОШЧЫЦ (Інж.). Выраб крухмалу з бульбы. 1930 г. ц. 70 к.
АЎТАМАБІЛЬ, ДАРБУДАЎНІЦТВА
САФРОНАЎ. Даведнік рэмаўцёра. 1932 г. ц. 75 к.
ШАБУНІО. (Інж.). Аўтамабільныя дароги, ч 1. Гудранаваньне дарог. 1930 г. ц. 50 к.
ШМУЙЛОЎ. (Аўтамабіль. Капоткае запісаньне будовы і догляду яго. 1931 г. ц. 70 к.
Б-КА ТРА